Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 29 (2879) Год LVI | Беласток, 17 ліпеня 2011 г. | Цана 2,50 зл. (у тым VAT 5%)

„Цацачная крама" — гэта, можна сказаць, спецыяльнасць маладых акцёраў, практыкуючых у час заняткаў „Гульня ў тэатр", якія вядзе аб'яднанне АБ-БА. Ледзь паглядзелі прэм'еру яе новай версіі — „Краму з песнямі", а ўжо зноў запрасілі нас на новы спектакль. „Станцыю вар'ятаў" запрэзентавалі ў мінулую нядзелю. Спектакль — вынік адпачынку старэйшай групы ў час чарговага летніка, які на гэты раз праходзіў у Бабіках. Дай Божа, каб усе дзеці ўмелі так фантастычна адпачываць!

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

ВАР'ЯТЫ Ў БАБІКАХ!

— Відаць у гэтай моладзі энтузіязм, відаць, што ім хочацца тэатра, — сказаў пісьменнік Сакрат Яновіч, які ўжо другі раз, пасля „Ой, даўно, даўно", меў нагоду цешыць вочы аббаўскай тэатральнай „прадукцыяй".

— Выдатныя гэтыя маладыя акцёры! — ад захаплення свяціўся ўсмешкай твар Гражыны Зофіі Куклік, дырэктар Пачатковай школы імя А. Міцкевіча ў Бабіках. — Спектакль быў цудоўны, дагэтуль адчуваю дрыжыкі, калі ўспомню. Упершыню такі летнік прайшоў у нас і ўпершыню былі гэта дзеці, якія вывучаюць беларускую мову. Гэта важна, бо і ў нас вядзецца навучанне роднай мовы. Спадзяюся, што супрацоўніцтва працягнецца.

Супрацоўніцтва гэта далейшая перспектыва. Для ўдзельнікаў летніка лічыцца тут і зараз. „Зялёна мне", „Марыська" (беларускі варыянт славутай „Małgośki"), „Nie ma jak pompa", фінальнае „Niech żyje bal" ды іншыя з дзесяці праспяваных песень гэта быў выклік. За чатыры дні моладзь падрыхтавалася вакальна, але і трэба было зайграць свае ролі, а на „Станцыі вар'ятаў" паяўляецца багацце персанажаў, м.ін. Прыбіральшчыца, Бабуля з Унукам, Футбольны Суддзя, Хіпі-Філосафка, Цыганкі, Тайная Агентка з Паліцыянтам ці Разгубленая Маладуха з ружовай энергіяй.

— Вельмі хваляваліся, а я хіба найбольш за ўсё сваё жыццё, — какетнічае з намі Аліна Ваўранюк, апякунка, а на гэты раз і акцёрка спектакля (адна з цыганак).

Хваляваліся напэўна таму, што мала спалі, шмат працавалі ды спадзяваліся, што ёсць патэнцыял, каб скарыць публіку. А над патэнцыялам амаль безупынна працаваў Бернард Мацей Баня, акцёр беластоцкага Драматычнага тэатра імя А. Вянгеркі.

— Гэтая група небывала дысцыплінаваная, проста скарб. 14-15 гадоў гэта такі самы дурны ўзрост, а яны, зусім наадварот, працуюць і гуляюць разам, адзін за другім у агонь пойдуць, — гаворыць Бернард Баня. — Адчуваю вялікую прыемнасць працы з імі. Працавалі мы ўжо пры „Краме з песнямі". Але тут я хацеў, каб мы падрыхтавалі поўны спектакль, у якім выкананыя песні былі б вынікам акцыі. Аліна адказала на мой выклік і ўзялася за рызыкоўную працу над перакладамі тэкстаў Агнешкі Асецкай, з чым справілася выдатна. Уявіце сабе, што я сяджу пры адным ноўтбуку і пішу тэксты, а побач мяне сядзіць Аліна і на другім ноўтбуку паралельна іх перакладае.

— Не думала я, што можна перакласці тэксты Агнешкі Асецкай, — прызнаецца Аліна Ваўранюк. — Для мяне гэта вялікі вопыт, таксама, калі ідзе пра працу з прафесіяналам. Ведаю ўжо як разагрэць цела, голас. Ведаю таксама, што пэўных рэчаў я ніколі не здолею зрабіць. Для гэтага патрэбная адукацыя. Калі працуе прафесіянал, адчуваецца гэта ў кожнай хвіліне. Наш спектакль — доказ на тое, што можна не спяваць, а заспяваць.

Раней у спектаклі на аснове песень Агнешкі Асецкай выступаў сам Баня. Заінспіраваны працай рэжысёра Пятра Зіневіча, вырашыў сам пазмагацца з гэтым матэрыялам.

— Выбралі мы такія песні, каб дзеці змаглі іх ахапіць. Нельга таксама забываць, што хаця рыхтуем сапраўдны мюзікл, надалей мае быць гэта гульня, — гаворыць аўтар і рэжысёр „Станцыі вар'ятаў". — Дыялогі і тэксты я пісаў пад канкрэтныя асобы. Дзякуючы вопыту працы пры папярэднім спектаклі, я ўжо ведаў магчымасці і характар паасобных удзельнікаў. Дарэчы, калі мы гутарылі з моладдзю над іх ролямі, я пераконваў, каб таксама ў кожнай песні яны знайшлі нешта сваё, часцінку сябе. Дзве песні пайшлі ў арыгінале. Мне хацелася, каб быў гэта спектакль, які спалучае культуры.

— Разумныя тэксты — гэтае хочам у першую чаргу занесці гледачам, — дадае Аліна Ваўранюк. — Ды яшчэ пакажаць, што дзеці ў нас таленавітыя і можна зрабіць нешта цікавае, карыстаючыся не толькі беларускімі здабыткамі, захоўваючы беларускую мову!

— Напэўна была нагода да смеху, калі ў час апошніх рэпетыцый я змагаўся з беларускай мовай спектакля, — смяецца Бернард Баня. — Моладзь увесь час гаварыла па-беларуску, хаця са мной размаўлялі па-польску. Усё ж такі, калі я прачнуўся ў сваёй хаце, запытаў у жонкі: „Што ты хцэш?". З беларускай мовай я ўжо сутыкнуўся працуючы з Генадзем Мушпертам з гарадзенскага драмтэатра пры „Самотным захадзе", маім любімым дагэтуль спектаклі, у якім я выступаў.

Працу з новым супрацоўнікам АБ-БЫ палюбілі маладыя акцёры

— Часам пажартуе, але і вымагае, бывае жорсткі, але ёсць вынікі і прыемнасць. Гуляў ён з намі да рання ў каламбуры і нашую любімую „Мафію", — гаворыць Ніна Ваўранюк, у спектаклі Прыбіральшчыца, якая марыць пра вялікую кар'еру.

— Я хацела б пайсці на заняткі для моладзі пры Драматычным тэатры. Спадабалася мне такая амаль прафесійная праца, — прызнае Начальнік Станцыі — Дар'я Дажынко.

— Абавязкова напішыце, што ён геніяльна працуе з моладдзю. Гэта адчуваецца. А пры тым Бернард — выдатны псіхолаг, — падказала яшчэ Аліна Ваўранюк.

А геніяльным цэлы спектакль палічылі таксама бацькі.

— Даўно столькі я не смяяўся, — сказаў бацька Цыганкі — Юлькі Тымашэвіч.

Бабікі гэта такі канец свету, асабліва для навучання беларускай мовы (нягледзячы на тое, што амаль на мяжы з Беларуссю). Шкада, што спектакля не паглядзела цэлая вёска, бо Марылю Радовіч з тэлевізара асацыююць напэўна ўсе. Можа з гэтага моманту пачалі б спяваць беларускую „Марыську"?

Чаго баіцца чыноўнік

Еўропа чарговы раз загаварыла пра Беларусь. На штогадовай сесіі Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе ўхваленая яшчэ адна рэзалюцыя па Беларусі.

Не адзіная, не першая, і напэўна не апошняя заява. Праўда, дзеля справядлівасці трэба адзначыць, што на гэты раз за заявамі ідуць спробы падмацаваць іх змест канкрэтнымі дзеяннямі. І Еўрасаюз, і ЗША ўжо прынялі пэўныя санкцыі ў адносінах да сённяшняга беларускага рэжыму. Складзены спіс неўязных асоб на тэрыторыю краін Еўрапейскага Саюза і Злучаных Штатаў, які перыядычна папаўняецца. Уведзены і пэўныя эканамічныя абмежаванні. З некаторымі беларускімі фірмамі гэтыя краіны больш не хочуць мець спраў. Некаторыя еўрапейскія і амерыканскія тавары, асабліва спецыяльныя сродкі, якія можна ўжываць супраць дэманстрантаў, забаронена прадаваць прадстаўнікам сённяшняй беларускай улады.

Зрэшты, для сённяшняй беларускай улады гэта ўсё не так страшна. Заявы яе не асабліва хвалююць, ды і ніколі не хвалявалі. Для чыноўніка сістэмы, створанай у Беларусі за апошнія 17 гадоў, больш страшным з'яўляецца касы позірк яго непасрэднага начальніка, чым абурэнне ўсяго свету. Ды і за мяжу чыноўнікі і так баяліся выязджаць па той банальнай прычыне, што не ведалі як на гэта адрэагуе ўсё той жа непасрэдны.

Неабходныя тавары, што сёння забаронены для продажу ў Беларусь, улада ўжо закупіла раней. Усе АМАПаўцы выходзяць шчыльнымі шэрагамі цалкам апранутыя па сезоне, адпаведна абутыя і з поўным наборам усіх неабходных для іх задачы спецыяльных сродкаў. Зрэшты, як і ўсе астатнія адпаведныя службы. Ну а калі чаго будзе не хапаць, то заўсёды гэта можна набыць у іншым месцы. Напрыклад, у Кітаі. Там да такіх рэчаў ставяцца нашмат сур'ёзней, чым да неабходных для жыцця чалавека тавараў, і робяць іх не горшымі па якасці, чым у Еўропе.

Што тычыцца таго непрымальнага для Еўрасаюза і ЗША бізнесу і канкрэтных бізнесоўцаў, дык усім вядома, што без гэтай улады яны не сталі б ажно настолькі паспяховымі. Так што чакаць, што яны стануць наракаць на ўладу, не прыходзіцца. Зрэшты, яны самі з'яўляюцца часткай гэтай улады і гэтай сістэмы.

Крыху цяжэй з Міжнародным валютным фондам. Без крэдытаў МВФ утрымацца на ўзроўні тых эканамічных паказчыкаў, якія аптымістычна абвяшчаюць айчынныя эканамісты, будзе не проста вельмі цяжка, але хутчэй немажліва. Ды і тут ёсць выйсце. Ёсць Расія, ёсць ЕўрАзЭС, ёсць, хоць невялічкія, але ж крэдыты. Ды яшчэ можна і абмежаваць усім права набываць валюту свабодна. І вываз ды ўвоз тавару можна абмежаваць да мінімуму. Ці, як аб'яўлялася з самай высокай трыбуны, можна і межы зачыніць. Таму і санкцый МВФ наш чыноўнік не баіцца.

Праўда, і там не усё проста. ЕўрАзЭС, ці дакладней Расія, проста так нічога не дае і ўжо патрабуе ўзамен хіба тое, чаго аддаваць не хочацца. Ды час ад часу нават заікаецца, што гэтак жа як і еўрапейцы з амерыканцамі, ЕўрАзЭС не разумее ў якім стане знаходзіцца сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сябры па эканамічнай прасторы, казахі, таксама не спяшаюцца хваліць беларускую сістэму. А ўкраінцы ўвогуле ў Вярхоўнай радзе 8 ліпеня заявілі пра стварэнне міжфракцыйнага аб'яднання ў падтрымку незалежнасці і дэмакратыі ў Беларусі.

Усё гэта нашаму чыноўніку ўжо вельмі непрыемна. Самыя блізкія суседзі намі незадаволеныя. Гэта значыць, што развальваецца ўся новаствораная за гэтыя гады ідэалогія. Але і гэта не страшна. Ёсць яшчэ што прадаваць, што аддаць. На іх век хопіць. А ідэалогію можна прыдумаць новую. Справа не невядомая, і добра адшліфаваная. Не прывыкаць. А ідэолагаў хапае. Таму і гэта чыноўніку не страшна.

А страшна яму тады, калі яго маці, або жонка, або дзеці, або блізкія сваякі выйдуць на плошчу свайго горада і стануць пляскаць у ладкі. І тады ў чыноўніка сапраўды пачнуцца вялікія асабістыя праблемы. Як мінімум, ён ужо тады чыноўнікам не будзе. І яму ўпершыню зараз стала некамфортна. Бо людзі выходзяць, і пляскаюць.

Віктар САЗОНАЎ

Эпітафія для Вацка

Дарога з Нарвы ў маю вёску, якой праезд на ровары займае мне не больш чым дваццаць хвілін, у гэты раз працягнулася да трох гадзін. Каб не было ніякіх недамовак, тлумачу адразу чаму: бо я ратаваў свет! Незлічоныя разы саскокваў я з ровара і ратаваў свет перад загубай. Калі я яго ўжо ўратаваў, зноў ускокваў на сядзельца, замахваўся педалямі і, праехаўшы дваццаць-трыццаць метраў, зноў спыняўся з піскам тармазоў, каб у чарговы раз ратаваць свет. Скажу праўду: ратаванне свету — занятак утомны. Дахаты я даехаў фізічна і псіхічна змардаваны. А ўсё гэта з-за слімакоў. Або... маёй сяброўкі Ё. — асобы прынцыповай адносна экалогіі, павагі да жыцця ўсякага стварэння і заадно непрымірымага ворага чалавечай бяздумнасці. Гэта якраз Ё. сваёй непахіснай пазіцыяй ваюючай эколажкі ўдрукавала ў мяне рэфлекс ратавання свету. Бо тое, што трэба яго ратаваць, ведае ўжо кожны. Толькі не кожны ведае ад чаго. А вось ад духоўнай ляноты, прыроднай чалавечаму роду, якая нашыя добрыя з натуры і спагадлівыя сэрцы звычайна адключвае. Я дакінуў бы да гэтага невуцтва і напыхлівасць — сёстры-блізнючкі ляноты. Вось яны найбольшыя і найярыя ворагі людства. Гэта значыць, што сапраўдным ворагам чалавека з'яўляецца чалавек, а мой найбольшы вораг — я сам для сябе. Ратаванне свету гэта няйначай як руплівае і бясконцае выполванне з уласнай душы прыродных ёй гультайства, напыхлівасці і невуцтва. Хто гэта занядбоўвае, той забівае сябе самога, забівае кожнага з нас, забівае ўвесь свет.

Ратаванне свету пачаў я са слімакоў. А паколькі дажджлівае надвор'е разбудзіла іх з гібернацыйнай дрымоты, дык вылазяць яны з закавулкаў прыроды і жыруюць як дурныя, не зважаючы на ўсе чалавечыя законы, забароны і дэкрэты, асабліва тыя наконт правілаў дарожнага руху. Дык пералазяць яны маставыя ў непазначаных месцах, за нішто маюць дарожныя знакі, а бывае, што засынаюць пасярод дарогі. Ну, упартыя істоты! Проста нялюдска ўпартыя! А калі схочуць перайсці тут і цяпер рухлівую шашу, дык пераходзяць, хоць туды і сюды мчацца нячулыя на іх бяспеку аўтамашыны. І трах! Трах! Пашкадаваў я іх. Тым раздушаным не мог ужо пасобіць. А ацалелых браў у пальцы і пераносіў на абочыну. І так вось даехаў я да сваёй хаты. Што разагнаў ровар, мусіў ціснуць на педалі. І зноўку ратаваў свет. Ведаю, што гэта бязглуздзіца, бо колькі ж тых слімакоў уратаваў я тады ад смерці. А колькі не змог уратаваць? Так як Вацка...

Вацак — буйны слімак — заўпарціўся пражываць паблізу ўваходных дзвярэй у маю хату, дзе на бетоннай выліўцы, аброслай зеленню, знайшоў сабе смакавіты жыр. Гаварыў я яму, казаў: „Вацак, пільнуйся, не абжырайся тут, дзе кожны, хто выходзіць з майго дому, можа цябе раздушыць". Некалькі раз экспульсаваў я яго ў іншае месца, ды дурань вяртаўся туды, дзе яму здавалася, што там найлепш. „Вацак! Вацак!" — верашчаў я на прыдурка і зноў пераносіў яго далей у агарод. А паколькі намазаў я яму на шкарлупцы рыску нязмыўным фламастарам, ведаў, што гэта Вацак! Сваіх гасцей я заўжды асцерагаў, каб, выходзіўшы, глянулі пад ногі, бо... Вацак! І спаглядалі яны ўважліва... на маю галаву. Што ў той час думалі, што гаварылі за вочы, не хочацца мне нават ведаць. Аднойчы я, спяшаючыся да мабільнай крамы, што заехала ў вёску, прызнаюся, моцна спознены бо праспаўшы, выбег з хаты як шалёны, не глянуўшы пад ногі. Штосьці хрумснула пад ступаком, я пакаўзнуўся і амаль не грымнуўся на морду... Вацак!

Хто я? Хто Вацак? Хто каму заняў жыццёвае месца? А чым ёсць мая шкарлупа — сялянскі дом? Хтосьці абурыцца тут і скажа, што гэта нейкая старэчая прыдуркаватасць. Ежы Шаняўскі, адзін з маіх літаратурных метраў у драме „Марак" склаў непераўзыдзеную фразу: „Старэчай прыдуркаватасцю людзі называюць і тыя рэчы, з якіх ужо выраслі, і часта тыя рэчы, да якіх яшчэ не дараслі". Праўда гэта, ці не?

Міраслаў ГРЫКА

Вачыма еўрапейца

Польшча о'кей?

Больш за дзвесце індывідуальных подпісаў, дэкларацыі падтрымкі ад дваццаці пяці падляшскіх гмін і каля дваццаці няўрадавых арганізацый назбіралася пад заклікам да ўлад Беларусі за як найхутчэйшае ўступленне ў сілу дамовы аб польска-беларускім малым памежным руху (МПР). Подпісы збіралі галоўным чынам на сайтах падляшскага дэпутата ад Грамадзянскай платформы, віцэ-старшыні сеймавай камісіі замежных спраў і старшыні парламенцкай групы па справах Беларусі Роберта Тышкевіча. Гэта ён на пачатку чэрвеня ініцыяваў акцыю (заклік паставіў як дэпутат). Як мы ўжо пісалі ў „Ніве", у закліку напісаў ён, што МПР „спросціць міжчалавечыя кантакты, зробіць магчымым вядзенне адукацыйнага і культурнага абмену, на якім залежыць уладам абедзвюх дзяржаў", а таксама „пазітыўна паўплывае на эканамічнае развіццё абшараў распаложаных па абодвух баках мяжы". Дадаў: „Працяглае чаканне рашэнняў улад Рэспублікі Беларусь спрычыняецца да зразумелага раздражнення грамадзян, улад самакіравання і грамадскіх арганізацый". Прыгадаў, што з польскага боку ўсе ратыфікацыйныя працэдуры практычна былі завершаны ўжо 22 снежня 2010 г., калі адпаведны подпіс пад дамовай паставіў на пагранпераходзе ў Кузніцы-Беластоцкай прэзідэнт Браніслаў Камароўскі. Неўзабаве пасля таго, як у час прэс-канферэнцыі дэпутат Тышкевіч апавясціў свой заклік, генконсул РБ у Беластоку Аляксандр Берабеня заявіў па Радыё Беласток, што прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка яшчэ ў снежні мінулага года таксама падпісаў дамову. Адзначыў, аднак, што адпаведнай ноты ў гэтай справе беларускі бок дагэтуль не накіраваў (пасля абмену нотамі дамова ўступае ў сілу на працягу месяца), паколькі з'явіліся тэхнічныя праблемы з прынтарамі для друку дакументаў асобам упаўнаважаным да перамяшчання ў трыццаці-кіламетровым памежным поясе, ахопленым МПР. Пасля беларускае пасольства тлумачыла, што праблема заключаецца ў благіх палітычных стасунках паміж Польшчай і Беларуссю, віна ў якіх — на польскім баку. У канцы чэрвеня прэс-сакратар мінскага МЗС сказаў, што нота будзе накіравана ў другой палове гэтага года, значыць — да канца года.

6 ліпеня дэпутат Тышкевіч урачыста завяршыў сваю акцыю на пляцы перад беластоцкай ратушшу. Выпусцілі ў паветра каля сотні блакітных шароў з заклікам. Мелі паляцець яны ў бок усходняга суседа; куды фактычна паляцелі — ведае адзін вецер.

— Я разумею, што дамова ўступіць у сілу яшчэ сёлета, — сказаў дэпутат перад ратушшу, спасылаючыся на заявы МЗС у Мінску. І дадаў: — МПР гэта ініцыятыва, якая датычыць каля двух мільёнаў людзей на абодвух баках мяжы, людзей, якія з нецярплівасцю яе чакаюць.

Група сабраных у час фіналу акцыі таксама выказвала сваю нецярплівасць. Адна з жанчын наракала: „У мяне пад Гроднам ёсць родныя. Чаму так цяжка мне з імі спаткацца? Калі б была гэтая дамова, я не мусіла б хадайнічаць за візу і магла б да іх ездзіць у кожную хвіліну".

Пералічаныя дэпутатам два мільёны пачакаюць яшчэ крыху малога памежнага руху, да часу дакларавaнага беларускім МЗС накіравання ноты. І толькі цікава, што такое сталася, што за час каля трох тыдняў, мінуўшых ад абвяшчэння пасольствам РБ галоўнай прычыны ненакіравання ноты (нядобрыя польска-беларускія адносіны па польскай віне), мінскае МЗС, усё ж, прадбачыла яе накіраванне да канца года. Ці мо значыць гэта, што Польшча ў вачах афіцыйнай Беларусі становіцца ўжо ў палітычным плане о'кей?

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Тэкст і фота Міры Лукшы

На памежжы трох гмін

Найлепш даехаць да Нарвы і адтуль гаспадары давядуць вас да месца, куды вы сабраліся ў адпачынак, — тлумачаць турыстам, якім хочацца заблукацца ў Граматнае. — З Нарвы едзецца ў Макаўку, за Макаўкай трэба павярнуць улева на Рыбакі. Даязджаючы ў Рыбакі, едзьце проста, не ўязджаючы ў вёску. Лясной жвіровай дарогай трэба праехаць тры з паловай кіламетра. Не трэба паварочваць улева ў напрамку двух дарожных знакаў. Выязджаючы з лесу, павернеце ўлева пры першым ледзь бачным будынку. Мінаеце яго і наступныя будынкі з левага боку — гэта ёсць і ваша мэта: агратурыстычная кватэра „У Сянкевічаў”.

Сям'я Сянкевічаў

Кватэра атрымала ў катэгарызацыі прамацыйны знак „Краіны зубра”.

Вітае вас зялёная прастора.

Дом распаложаны на ўскраіне Лядскай пушчы, што ўваходзіць у склад ляснога комплексу Белавежскай пушчы ад вусця ракі Нараўкі ў Нарву. Абедзве рэчкі знаходзяцца ў адлегласці паўкіламетра ад хаты, і відаць іх з тэрасы і балкона. У час веснавога паўнаводдзя абедзве рэчкі разліваюцца на лугі і наўкола сядзіб Сянкевічаў бушуе дзікае птаства. Ад дарогі відаць дом з характэрнымі для гэтай ваколіцы аканіцамі і аздобамі. Дом акаляе вялікі падворак са старым садам, пляцам для забаў для дзяцей, месцам для гульні ў валейбол, усё агароджанае хваёвымі балясамі. Высіцца жораў студні. Побач падворка вялікае месца на вогнішча са сталом пад дашком і лаўкамі. Побач дома прабягае новаствораны Блакітны веласіпедны шлях (можна пазычыць пяць веласіпедаў), — у краіну адкрытых аканіц — у вёскі Трасцянка, Сацы і Пухлы і ў другі бок — у Белавежу. Да Семяноўскага вадасховішча адсюль дзесяць кіламетраў. Пад паветкай стаіць пяць байдарак. На Нарве і Нараўцы можна арганізаваць байдарачныя паходы і летам карыстацца пляжамі. У лясной цішы можна тут адпачыць! — заахвочваюць гаспадары.

— Мне найбольш адпавядае тое, што можна з людзьмі спаткацца, пагаварыць, перакінуцца думкамі, проста пасядзець з імі, — смяецца чарнявы Міраслаў Сянкевіч, былы дрывасек-пільшчык і трактарыст у надлясніцтве Броўск. Тое надлясніцтва — у Нараўчанскай гміне, бо згэтуль бліжэй да Нараўкі, чым у гмінную Нарву. — Вядома, жывем з агратурызму. Даведваюцца пра нас з інтэрнэту і „пантафлёвай” поштай — з вуснаў у вусны. Прыязджаюць не раз. Да нас можна прыехаць на адпачынак са сваімі любімцамі — катом ці сабакам. А што мы маем — кабылку... Трох зайчыкаў... А маёмасць маем тут аж ад прадзеда. Родам ён быў з Койлаў, нарадзіўся ў 1880 годзе. Дзед быў Грышка, дзедаў сын таксама Грышка. Зайшоў я паперы афармляць, пытаецца пані ў гміне: усе *Гжэгожы?* А так! А я Мірак — і Ірку сабе падшукаў, Варанецкую!

Міраслаў і Ірэна з дочкамі Касяй і Басяй, Сянкевічы, адна з сем'яў Сянкевічаў „на Сянкевічах” у Граматным. Гаспадараць на дзвюх хатах — адна ў іх у Нарве. І з Нарвы, калі трэба, праводзяць на сваё ўрочышча гасцей з краіны і замежжа, якім даспадобы ціш Лядскай пушчы. І каб прывабіць турыста, трэба навінкі. Што і раз трэба штосьці дабудоўваць.

— Саўна была, але згарэла. Пакансультаваўся я быў у Панкоўскага ў Семяноўцы, зрабіў такую самую. Трохі яшчэ чытаў у кнігах, у інтэрнэце, дадаў сваё — і зрабіў. Ну, згарэла, толькі тырчаць слупы. Новую трэба. Тая першая большая была, у інтэрнэце ёсць яшчэ на здымку наша старая саўна. Быў дашок, на дашку была бочка, вада нагрэецца за дзень, можна было прыняць душ. Сам не дапільнаваў, госці скарыстаўшы паразлазіліся... А тут ужо новая саўна. Печка на каменне, паліцы, венікі... Засушваю венікі, на пасля. Прыязджаюць — з Вроцлава, са Швецыі... Прафесары геаграфіі былі ў мінулым годзе, пасля былі іх вучні, адны адным перадаюць інфармацыю. Спадабалася.

— Маем дзесяць гектараў зямлі: палову робім, палову не, бо на двое зацяжка. Авёс сеем, бо кабылку маем. Рэшта — сена. Адзін гаспадар мае сто кароў, сена ў нас купляе, — дадае Ірэна.

— Былі тут адны Сянкевічы, але паявілася „навалач” з Варшавы, купілі ўчастак, пару гектараў дакупілі, у 1992 годзе. Яшчэ ў той час не было гэта моднае...

Пасярод падворка — прыгожая, каляровая хата.

— Хата была ў 1976 годзе разабраная, тая сапраўдная, радзінная. Але я зрабіў такую самую, якая была. Падмурак арыгінальны, з 1939 года. Вядома, была вайна, і рознае ў сям'і таксама бывала, — прызнаецца Міраслаў. — Бацькава сястра хацела зямлі, кампенсацыі, свае часткі. Быў гэта 1971 год. Сядзелі дома, выпівалі. Я тады быў малы, памятаю. Тата ўзяў мяшок, накапаў зямлі і кажа: „О, то твая часць зямлі. Калі ты была маладая, ты паехала ў Шчэцін, мы цябе кармілі, грошы давалі, а ты цяпер ад нас яшчэ чагосьці хочаш? Мы цяпер у цяжкай сітуацыі...”. Дарэчы, у сельскай гаспадарцы і тады грошай не мелі, хоць залежыць дзе... Сястра ў 1971 годзе прыехала новым фіатам 125п. Было гэта штось, не? Больш ужо не прыехала. Жартаў з бацькам не было. Быў тут яшчэ бацькаў брат. Хату тую прадалі, за пару месяцаў прагулялі — і ўсё. А я хату пачаў ставіць у 1999 годзе, бацька пайшоў на пенсію, а наша зямля была яшчэ на дзеда. Перапісалі проста з дзеда цераз бацьку проста на мяне, брата і сястру. Я сказаў, што хачу, каб гэты падворак быў мой. І хату я зрабіў з новага дрэва, верандачкі яшчэ тады не было, і тэраску зрабіў з гэтага боку. І аздобы схацеў зрабіць. Паехалі ў Трасцянку, у Сацы, выбралі такія як нам пасавалі, зрабілі здымкі, прыехалі дахаты... Кася са здымкаў перанесла на камп'ютар, з камп'ютара на паперу, зрабіла шаблон, а я ўжо далей — рэшту. А работы было шмат, хоць цяпер ужо ёсць добрыя прылады. А як калісь людзі рабілі — во было работы!

Міраслаў з любасцю глядзіць на выпешчаную хату і працягвае ўспамін:

— У 1989 годзе тут у Сянкевічах было зацесна, Кася была малая, Бася крышку большая, у школу далёка, дык я паставіў хату ў Нарве. Думаў, бліжэй будзе, але аказалася — што далей. Бо тут — я ў сябе, і тут відней. Цяпер з Нарвы ездзяць сюды. І гэтая хатка — ужо начыста для турыстаў. А тая, у якой мы жывем у Граматным — з гаража. Усё легальна — перабудова з гаспадарчага будынка на жыллёвы. Ёсць усе камунікацыі, водаправод. Пашчасцілася — быў радны згэтуль і давялі ваду. А было суха, не было чым паіць кароў... Давялі нам і водаправод з Нараўчанскай гміны, а з Нарвы — толькі цяпер вялі. У Нараўчанскую гміну — толькі кіламетр водаправода. Блізка, мала грошай, было пару ахвотных — і раз-два падключылі, і маем ваду!

Дзяўчаты — светлыя, як мама, зусім непадобныя з выгляду на свайго смуглявага тату, Бася — студэнтка рускай філалогіі, і Кася сёлетняя выпускніца Мастацкага ліцэя ў Супраслі, летам дапамагаюць бацькам у аграгаспадарцы. Перш за ўсё — праз інтэрнэт; у цяперашняй „глабальнай вёсцы” адсюль блізка. Можна было б і разгарнуць хатні праект... Ды...

— Калі набудуеш, панастаўляеш усяго, не будзеш мець часу, каб з турыстамі пагаварыць. Пасядзець. Яны расказваюць сваё, а я сваё, — смяюцца жывыя вочы Міраслава. — Тут лішне няма чаго больш будаваць. Думалі тут даставіць яшчэ адзін будынак, ды памеркавалі і адмовіліся — было б зацесна. Прастора! І нічога не бегае па падворку — ні курэй, ні гусей, бо столькі тут „паляўнічых” ёсць на гэтых куранят — сто метраў ад лесу. А ў лесе маем чорнага бусла, орліка...

— Звоняць, дапытваюцца: падворак ёсць? Ёсць. Агароджаны? Трэба каб было тым дзецям пагуляць, — дадае Ірэна. — Калі гаворка пра байдаркі, дык вылаўлівае іх Лена Харкевіч, можа больш дае аб'яў пра водныя спорты. Як субота, нядзеля — відаць, што плаваюць. Мо больш мае турыстаў Барыс, але і мы не наракаем.

— У нас зімою — катанне на санках. Так з восем кулігаў. Ці гэта шмат? Часам ёсць файная група на файны куліг — а тут якраз снег растаў! — жартуе гаспадар і любуецца хаткай: — Расклад вокан — як калісьці. Больш каштавалі гэтыя вокны, чым новыя. Мусіў рабіць усё аднова, бо ж тае хаты не было. Пяць пакояў, лазенькі, усё ўжо сучаснае. Кухня ёсць, ды часцей турысты ядуць у нас. Шаляваў, будаваў. Кася намалявала карціну яшчэ быўшы ў гімназіі, проста на сцяне...

На стол — усё для смаку.

— Вырабы ў нас уласныя. Вось такая каўбаска. Мяса худзейшае і тлусцейшае. Кроенае. З прыпраў толькі перац, гарчыца, каляндра. А наліўкі — перш за ўсё на буквіцы. І мусіць пастаяць. А турысты вельмі любяць хлеб, які купляем у Нарве, з пякарні Падальшынскіх у Гайнаўцы. Не таму, што танны, а таму што смачны.

Сянкевічы цікавяцца гісторыяй роду. Якраз учора Міраслаў правяраў старыя дакументы ў гміне. І праз той славуты інтэрнэт можна пашукаць...

— Бацька Грыша быў бондар адметны. Яшчэ чаляднікам рабіў бочку і прадаў. На Цімахі, наўпрашчкі, вазіў бочкі ў Нарву. Ад майстра пераняў кліентаў, бо лепшыя бочкі рабіў... А прадзед з Койлаў быў, выкарчавалі тут усё, пасяліліся. Адзін бок, вось, маем з Койлаў, а другі — з Чыжоў. Цікаўлюся родам. І такім пытаннем: у якім годзе праставалі рэчку Нараўку? Паўтара кіламетра капалі ўручную...

Заедзеце „ў Сянкевічы” — спадзявайцеся, што не прыйдзецца вам маўчаць! Ды гэта так для смаку жыцця, ажыўлення яго свойскай размовай. Тут гавораць па-польску, па-англійску, па-руску, ды перш за ўсё — па-беларуску. І мо верш напішаце, натхнёныя, як Кася Сянкевіч — „дачка ружы”, дачка Сянкевічаў.

Рамантуюць дарогі

— Сёлета гміна прызначыла 50 тысяч злотых на жвіраванне дарог, — сказаў войт Юры Шыкула. — Сорак тысяч выкарысталі на рамонт у траўні, дзесяць тысяч пакінулі на падсыпку ў летнім сезоне. Перш-наперш зрабілі даезд з Баброўкі ў Тураўшчызну. Гэта быў непраезны адрэзак, каля трыста метраў. Затым паправілі дарогу з Апакі ў Пагулянку і з Волькі-Тэрахоўскай у леснічоўку. Узнікала пільная патрэба рамантаваць дарогу з вёскі Чаромха ў Дашы, і з Янцэвічаў у Вульку-Нурэцкую (да мяжы з гмінай Нурэц-Станцыя Сямятыцкага павета). Праблему стварае тэрыторыя, якая знаходзіцца ва ўладанні чыгункі. Нельга тут праводзіць інвестыцыі і дарожныя работы, паколькі зямля не з'яўляецца гміннай маёмасцю. Тычыцца гэта, напрыклад, гравейкі на вуліцы Дзібуа — ад воданапорнай вежы да пераезда на дарозе Чаромха-Вёска — Кузава. Радныя прапанавалі асфальтаваць гэты адрэзак, але паколькі не дамовімся з чыгуначнымі начальнікамі, дык не ў змозе самі рашыць праблему. Клопат у тым, што згаданы грунт знаходзіцца ва ўладанні некалькіх чыгуначных суполак, з якімі цяжка дамовіцца. Так сама справа маецца з маёмасцю даўнейшага сельскагаспадарчага гуртка ў Ставішчах. Гміна шукала таксама ахвотнага добраўпарадкаваць пляцоўку, але няма з кім абмеркаваць справу.

Гэта праўда, што на чыгунцы зараз няма з кім гаварыць, каб вырашыць праблему ў карысць лакальнай грамадскасці. Чынушы прывыклі адно наракаць, што не хапае ім грошай, але не задумваюцца як іх здабыць. А наконт чаромхаўскіх дарог і жвіраваных вуліц можна сказаць, што сітуацыя паправілася. Каб ано далей так было!

Уладзімір СІДАРУК

Гайнаўка

Там, дзе быў прыгожы міні-парк

У Гайнаўцы кожнага году садзяць маладыя дрэўцы, між іншым, у гарадскім парку і на жыллёвых пасёлках паміж блокамі. Перш-наперш там, дзе іх найбольш ссеклі.

Раней Гайнаўка была зялёным горадам. У ім было больш дрэў. У шасцідзесятыя гады мінулага стагоддзя прыгожы міні-парк быў ля Гайнаўскага дома культуры. У ліпеньскую спёку можна было тут прыемна адпачыць у цяні векавых разгалістых дубоў, удыхаць арамат цвітучых вялікіх ліп, а восенню любавацца красою клёнавых лісткоў. Тады тут пабудавалі танцавальную пляцоўку з лавачкамі. Сюды ахвотна прыходзіла моладзь. Юнакі і дзяўчаты вярталіся дадому на досвітку. Тут яшчэ шмат вялікіх дрэў. І вось вадзіцелі якраз пад імі пачалі ставіць свае аўтамабілі. Гэтым самым руйнуюць гэтае прыгожае месца. Найбольш аўтамашын „паркавалі" падчас майскіх Дзён царкоўнай музыкі.

А побач жа знаходзіцца вялікая стаянка для аўтобусаў і легкавушак перад Гайнаўскім домам культуры. Меншая стаянка з маставой з брусчаткі знаходзіцца за агароджай Свята-Троіцкага сабора. Там трэба ставіць свае аўтамабілі. Там для іх месца.

Мне шкада колішняга міні-парку.

(яц)

Мара яго жыцця — Беларускі музей

Канстанціна Майсеню ўспамінае ***Міхал Харкевіч:***

Я — шматгадовы дзеяч БГКТ — таксама не стаяў з боку, калі пачыналася будова Беларускага музея. З яго будаўніком Канстанцінам Майсенем пазнаёміўся я ў 1960-х гадах, калі адкрывалі краму ў маіх родных Лешуках. Ён тады быў старшынёю Павятовага саюза гмінных кааператываў „Сялянская самадапамога" ў Гайнаўцы і праводзіў на Гайнаўшчыне акцыю будовы вясковых магазінаў. Пасля прамоваў і цырымоніі адкрыцця Майсеня сеў у службовую „Волгу" і ад'ехаў. Але па хвіліне вярнуўся, падышоў да моладзі і запытаў: „Не хочаце праехацца самаходам?". Вядома, гатоўнасць пракатацца на машыне выказала некалькі хлапчукоў, у тым ліку і я. У той час легкавушкі мы найчасцей бачылі на карцінках, а тут нечакана з'явілася нагода пракатацца на сапраўднай машыне!

Некалькі гадоў пазней пачаў я пазнаваць Канстанціна Майсеню як будаўніка, паколькі я сам працаваў сталяром, спачатку на будове керамічнага завода ў Старым Ляўкове, а потым на самім заводзе.У той час пабудаваў ён базу СКР у Нараўцы (цяпер у ёй змяшчаецца вытворчы цэх прадпрыемства „Пронар"), пачаў гадоўлю авечак у Масеве, выкарыстоўваючы будынкі былой пагранзаставы, пабудаваў бензастанцыю ў Новым Ляўкове, добраўпарадкаваў абору ў Лешуках. Майсеня быў ініцыятыўным чалавекам, поўным задум і прытым паслядоўным — умеў пераадольваць цяжкасці і даводзіць справу да канца.

Бліжэйшае знаёмства пачалося тады, калі Канстанцін Майсеня ўзначаліў керамічны завод у Старым Ляўкове. Пры ім завод набыў ранг самастойнага прадпрыемства, якога ён стаў дырэктарам. Тады быў пакладзены асфальт на завадскім пляцы і на даязных дарогах. Планаваў ён адкрыць завадскую сталовую, мяса для якой пастаўляла б свая свінаферма.

Настойлівасць дапамагла Канстанціну Майсеню здзейсніць мару яго жыцця — пабудаваць Беларускі музей. Не раз расказваў ён мне пра цяжкасці, якія спадарожнічалі будове. Пасля валакіты з рэгістрацыяй статута Грамадскага камітэта пабудовы пачалося валаводжанне з гарадскімі ўладамі за атрыманне пляца пад будову. Некаторыя тадышнія чыноўнікі перашкаджалі як маглі. Але калі і гэтыя перашкоды ўдалося яму пераадолець, пачаліся клопаты са здабыццём будаўнічых матэрыялаў і прыцягненнем фінансавых сродкаў. Майсеня высока цаніў падтрымку з боку Беларусі, асабліва беларускіх установаў. Беларускі бок да ідэі будовы музея ставіўся вельмі сур'ёзна, многа дапамог у матэрыяльным і арганізацыйным плане.

Аднойчы Канстацін Майсеня сказаў мне: „Не маю машыны ні дачы, жыву з жонкай у маленькай кватэры, але беларускі музей пабудую. Калі хтосьці страчвае сваю мову і культуру, траціць сваю нацыянальнасць, свой гонар". Быў ён поўнасцю адданы беларускай справе і мы павінны памятаць аб ім, аб яго здзяйсненнях. Асабліва нельга дапусціць, каб заняпаў музей. Ведаю, што былі спробы „замахнуцца" на музейны будынак. Лічу, што за ўтрыманне і развіццё музея павінны адказваць добра падрыхтаваныя кадры. Сёння з падборкай кадраў не павінна быць клопату. Знойдуцца людзі, якія выведуць музей на прамую дарогу. Толькі трэба стварыць яму адпаведныя ўмовы. Таму і цяпер спатрэбіўся б чалавек тыпу Канстанціна Майсені, які хадзіў бы ад установы да ўстановы і вырашаў бы ўсе складанасці, якія накапіліся вакол музея. Нават нельга дапускаць думкі аб прыватызацыі ці ліквідацыі нашага музея, які будаваўся беларусамі ўсяго свету. Неабходна наладзіць кантакт з праваслаўным духавенствам і музеямі ў Беларусі, падрыхтаваць выставы на рэлігійныя тэмы.

Калі бываю на рынку ў Гайнаўцы, гляджу на пустую сцяну, на якой красаваўся беларускі арнамент. Варожая рука зняла яго, не пытаючы нас — тых, каму сагграваў ён душу. Цяпер я жыву ў Старым Ляўкове. Сэрца крывёю аблiваецца, калі бачу як аматары даўніны скупляюць па вёсках вартасныя прадметы і вывозяць іх у глыб Польшчы, а нават за мяжу. А працаўнікі музея не ездзяць па вёсках у пошуках экспанатаў, не папаўняюць музейных фондаў прадметамі матэрыяльнай культуры нашых продкаў. У гэтым наша бяда, што не шануем свайго і тым самым губім сябе. Такая вось праўда, хаця яна горкая быццам дзёгаць. Але ўсё-такі праўда!

Запісаў Віктар БУРА

Сямейны фэст

Уладзімір СІДАРУК

26 чэрвеня чарамшане адзначалі прыхадское свята Іконы Божай Маці „Неспадзяваная радасць". У сувязі са святам Гмінны асяродак культуры арганізаваў жыхарам пасёлка сямейны фэст. Пачатак мерапрыемства быў назначаны на 16 гадзіну. Пра рэкламу задбалі працаўнікі ГАК, а падрыхтоўкай мерапрыемства занялося Прадпрыемства арганізавання эстрадных імпрэз. Атракцыёнамі найбольш пакарысталіся малечы. Для іх было прыспасоблена адмысловае „вясёлае мястэчка" — парк з атракцыёнамі, дзе можна было паспускацца „з горкі", паскакаць на гумовых падушках, пакатацца на аўтамабілі ці паездзіць вярхом на жывым коніку. Разумеецца, што за „ўцеху" трэба было заплаціць (пяць зл. за некалькі хвілін), але ахвотных хапала. Былі гульні ды конкурсы з падарункамі. Найбольшым поспехам карыстаўся „праход тунэлем" і гульня з мячамі. У мастацкай частцы выступілі гурты дамоў культуры з Гайнаўкі і Бельска-Падляшскага ды мясцовыя. Цікавы рэпертуар паказала Студыя эстраднай песні Гайнаўскага дома культуры і танцавальная група „Ілюзія". Канцэрт доўжыўся некалькі гадзін. Не пашанцавала мне пабыць да канца, паколькі выклікалі мяне дамашнія абавязкі. Пакідаў я пляцоўку на адвячорку ў поўным разгары забавы. Як пазней даведаўся, пасля мастацкай часткі была арганізавана дыскатэка, якая доўжылася далёка за поўнач. Шкада адно, што для музычнага гурту „Атут" з Сямятыч папсавалася тэхніка і таму не змог ён весяліць чарамшан на забаве. Але і так фэст можна лічыць удалым мерапрыемствам. Надвор'е паспрыяла ды і публіка не падвяла. І за гэта арганізатарам належыцца падзяка.

Фота Уладзіміра СІДАРУКА

Выступае Студыя эстраднай песні ГДК

Мілы ўспамін

У цэнтры Ваяводскага асяродка анімацыі культуры „Сподкі" па вуліцы Святога Роха 14 у Беластоку 14 мая адбылося святкаванне 55 юбілею „Нівы" Я, вельмі ўдзячная за запрашэнне Праграмнай радзе тыднёвіка „Ніва", прыняла ўдзел у гэтым мерапрыемстве. Увесь час панавала цёплая, сардэчная атмасфера, чуваць было ветлівыя словы, бачны былі ўсмешкі, абдымкі. Прыехала многа важных асоб. Я пачынала сваё супрацоўніцтва з „Нівай" недзе з 1971 года як яе карэспандэнт. Адсюль я, пасля дэбюту ў „Парнасіку", трапіла ў Беларускае літаратурнае аб'яднанне „Белавежа". У час імпрэзы выступіў гурт „Гульня ў тэатр" з пастаноўкай „Цацачная крама": вось растуць тут сапраўдныя акцёры! Развесяліў нас сваімі песнямі Зміцер Вайцюшкевіч. Многа было ўспамінаў, віншаванняў, а пасля таго быў сяброўскі пачастунак. Мне было прыемна сустрэць сваіх сяброў-карэспандэнтаў, між іншым Галену Тапалянскую і Уладзіміра Сідарука. Цёплы настрой гэтай сустрэчы застанецца незабыўным успамінам. Тыднёвіку „Ніва" жадаю поспехаў, многа чытачоў і далейшых юбілеяў.

Жэня МАРТЫНЮК

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

Не горшая Іншасць

Злева: Антоні Мілаш, Ірэна Грудзінская-Грос, Адам Загаеўскі, Марцэліюс Марцінайціс, Аліцыя Рыбалка

Два спатканні: філосафаў і паэтаў, званыя агорамі — адны з асноўных здарэнняў трохдзённай „Еўрапейскай агоры" напярэдадні польскага старшынства ў Еўрапейскім Саюзе. Сарганізаваны яны былі сейненскім Фондам і Цэнтрам „Памежжа — мастацтваў, культур, народаў" перад дворыкам у Краснагрудзе з нагоды стагоддзя з дня нараджэння Чэслава Мілаша. Дыскусіі былі прысвечаны пасланню, якое змяшчае ў сабе творчасць лаўрэата Нобелеўскай прэміі, шматкультурнасці і стану Еўропы, асабліва Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.

„Агору філосафаў" адкрыла выступленне аднаго з найбуйнейшых сучасных філосафаў, праф. Адама Баўмана, якога называюць „Платонам нашага часу":

— Бісмарк аднойчы сказаў, што Еўропа з'яўляецца геаграфічным паняццем. Гэта абазначае, што Еўропа не з'яўляецца палітычнай канцэпцыяй. Яна, чыста геаграфічнае паняцце, адыграла вялікую ролю ў сусветнай гісторыі. Дасягнула яна перавагі над усімі кантынентамі, служыла ім узорам. Ні адзін кантынент ніколі не дасягнуў перавагі над Еўропай. Гэта яна была першым кантынентам, які ўступіў на шлях мадэрнізацыі і фармаваў мадэль дэмакратычнага парадку (...). Асвечаныя розумы ўжо раней прадчувалі, што Еўропа губляе сваю сілу і дзейнічаць на старым падмурку ўжо не зможа. Я думаю, што вытокаў ЕС варта шукаць перш за ўсё ў краху еўрапейскай самаўпэўненасці.

Ён падкрэсліў:

— Асаблівасцю Еўропы з'яўляецца тое, што на працягу стагоддзяў практыкуе яна грамадскую разнастайнасць, якая заўсёды была мазаікай веравызнанняў, моў, культурных сведчанняў. Жыццё з Іншым з'яўляецца адной з асноўных чалавечых задач. Адтуль асаблівая перавага Еўропы, якая заўсёды спрабуе ажыццявіць майстэрства сужыцця з Іншымі і гэта так, каб Іншы не мусіў адмовіцца ад сваёй Іншасці (...). Гэта пасаг, які Еўропа можа даць свету, дар, якога свет патрабуе больш за ўсё, каб пазбавіцца клопатаў.

Філосаф і гісторык Ягелонскага ўніверсітэта праф. Цэзары Вадзінскі спытаў, што гэта абазначае „гасцінная Еўропа":

— Гасціннасць — загадкавае паняцце. Гасціннасць гэта іншасць. Сэнс гасціннасці знаходзіцца на пагранічах, паміж маёй і чужой краінай. Мы жывем у свеце, які зганьбаваў гасціннасць. Ён стаў знішчальна негасцінным (...). Калі прыняць, што ёсць безумоўная гасціннасць, то мы павінны пагадзіцца на шэраг няёмкіх паслядоўнасцей. Мы павінны прыняць госця, не ведаючы яго, і ўстрымлівацца ад любых праекцый датычных Іншага. Павінны адмовіцца ад пытанняў пра яго асобу, і нават адмовіцца ад ужывання сваёй мовы, таму што яна ўводзіла б умоўнасць. Калі мы безумоўна прымаем „гасцей", дык маўчком, значыць, адмаўляемся ад насілля, якое цягне за сабой выкарыстанне маёй мовы. Адмова ад мовы, гэта не варожая цішыня, але парадаксальнае чаканне таго, каб прамовіла сама сустрэча. Сітуацыя безумоўнай гасціннасці адмяняе зыходную сітуацыю: „гаспадар-госць", прадугледжвае адмову быць гаспадаром. Страчвае сілу пачуццё тоеснасці. Пагаджаешся на няпэўнасць. „Госць" з'яўляецца шокам для мяне і майго свету. Мы павінны прыняць гэтую рызыку, хаця прадугледжвае непрадбачаную небяспеку.

Прафесар Вадзінскі сцвярджаў, што „невыносная няёмкасць, звязаная з гасціннасцю, з'яўляецца няздымнай, таму што яна ўпісаная ў яе самую":

— Гэта бесперапыннае ўдасканальванне закону гасціннасці . (...). Чалавек прымае ў сябе дома яго Іншасць. Чалавек знаходзіцца дома, калі гасцюе ў сябе Іншага, і сам знаходзіцца ў яго цені.

У сваю чаргу „Агору паэтаў" перад дворыкам, у якім Чэслаў Мілаш правёў канікулы ў сваіх цётак, пачаў яго сын Антоні. На пачатак успомніў гісторыю, якая паказвае спрэчныя адносіны яго бацькі да Каталіцкага касцёла:

Адам Баўман

— Ён напісаў ліст Яну Паўлу II з просьбай, ці папа адабрае тое, што ён стварыў, і ці напісанае ім адпавядае каталіцкай артадоксіі. Папа не ведаў як выкруціцца і сказаў, што намер паэта мае вырашальнае значэнне.

Гаворачы аб паэзіі лаўрэата Нобелеўскай прэміі, Антоні Мілаш сказаў:

— Яго паэзія робіць уражанне старажытнай, але гэта ўсяго толькі хітрыкі, эрзац.

Адзін з найвыдатных польскіх паэтаў старэйшага пакалення Адам Загаеўскі ўспомніў аднаго з творчых настаўнікаў лаўрэата Нобелеўскай прэміі і знакамітага пісьменніка да- і пасляваеннага перыяду Яраслава Івашкевіча:

— Калі параўноўваць іх, то Івашкевіч спасылаецца на сваё жыццё і вопыт, а ў Мілаша ёсць нешта большае, што тычыцца ўніверсальнасці. Менавіта дакрананне да ўніверсальнасці з'яўляецца яго сілай. Ён карыстаецца апакаліптычнай, прароцкай мовай.

Параўнаў Мілаша таксама з іншымі сучаснымі яму паэтамі Юзэфам Чаховічам і Аннай Свярчынскай:

— Яны блукаюць у сваім асабістым жыцці, а ён адчувае спакусу займець таемныя веды пра тое, чым кіруецца свет.

Ён дадаў, спасылаючыся на выказванні Цэзары Вадзінскага:

— У многіх сваіх вершах адчувае ён сябе „гаспадаром", мае пачуццё ўлады над светам. Ён кажа: „Я разумею гэты свет". Звычайна гэта ў Мілаша інтрыгуе, але і раздражняе. Мілаш чэрпаў веды з таго, што ведаў больш, чым іншыя, але часам ён памыляўся. Універсальнасць Мілаша дала яму не толькі вялікую псіхалагічную сілу, але і паэтычную. Ён хацеў, каб увайсці ў кішэньку на сэрцы XX стагоддзя. Аднак няма паэта, які быў бы толькі „гаспадаром". Паэты бываюць таксама „гасцямі". Яны — памыляюцца і калісьці адыходзяць. „Госць" заўсёды адыходзіць, а „гаспадар" застаецца. Мілаш зразумеў, што ўсе паэты — „госці".

Антоні Мілаш:

— Мой бацька сказаў даволі іранічна, што паэзія — выратаванне народаў. Ён памёр тады, калі яму хацелася. Гэта было яго свядомае рашэнне. Не было ў ім гэтага падзелу паміж „гаспадаром" і „госцем".

Адам Загаеўскі адказаў сыну паэта:

— Творчасці Мілаша не спадарожнічае моцная іронія. Гэта спадарожная іронія.

І пажартаваў:

— Сыноў нельга дапускаць да голасу, бо яны заўсёды ведаюць лепш.

Марцэліюс Марцінайціс, паэт з Вільні, падкрэсліў:

— Мы бачым як Чэслаў Мілаш вяртаецца праз іншыя культуры і краіны, пераказваючы нам вопыт іншых культур. Праўдзівы паэт не баіцца сваіх падзенняў і свайго ўваскрэсення.

Аліцыя Рыбалка, віленская паэтка і перакладчыца:

— Мілаш ніколі не адчуваў сябе дома. Ні ў Літве, ні ў Польшчы, ні ў Францыі, ні ў ЗША.

Антоні Мілаш прыкінуў:

— Я не ведаю, ці адчуванне сябе, што ты цалкам дома, здаровае. Калі чалавек стопрацэнтна адчувае супольнасць з адным месцам, культурай, свет коціцца занадта хутка.

Ён адзначыў:

— Бацька ніколі не шукаў пераемнікаў.

(працяг будзе)

Злачынцы

Што такое краіна з наскрозь злачыннай уладай? Вы не ведаеце? А мне давялося пераканацца ў гэтым 22 чэрвеня 2011 года. Я не лажу ў сацыяльныя сеткі, не веру ў абсурд таптання на месцы вакол пустыннай плошчы пры поўнай адсутнасці лідара, але і мяне могуць залучыць у злачынцы самі так званыя праваахоўнікі, якія і зневажаюць права. Яны проста служаць знакамітаму клятвапарушальніку, які даў сабе права парушаць усе законы сваёй дзяржавы, якую нехта там ніяк не рызыкне пакараць санкцыямі, а яна гніе татальна ад самой дзіравай галавы.

Так выпала, што мне, інваліду 2-й групы па дыябэце, выпаў талон да доктара на 22 чэрвеня ў 16.50. Лекі, якія мне выпісалі, прадаюцца толькі ў адной аптэцы Мінска ля плошчы Перамогі. Я іх атрымаў у 18.40, але ўжыць не паспеў, бо месца перасадкі на метро дадому было ачэплена (станцыя Кастрычніцкая) і там адбываўся адлоў ахвяр рэжыму. Вінаваты ці не, ніхто не пытаўся. Такіх і не было, бо каталажкі пампавалі наўздагад. Ад турмы і торбы не заракайся, казалі нашы продкі, а хтосьці яшчэ верыў, што дастаткова проста быць сумленным чалавекам. Хіба не ў злачыннай міліцыйнай дзяржаве. Нават фашысты абвяшчалі нейкую каменданцкую гадзіну, якую нельга было парушаць, а лукашысты проста ловяць без аніякіх парушэнняў.

Налоўленых людзей, якія нічым не парушылі ніякага закону, пачалі збіваць ужо ў аўтобусе, зневажаць іх рознымі спосабамі, і чыніла тое БАНДА праваахоўнікаў, а потым завезлі ў райаддзел, здаецца Маскоўскі, недзе ў трамвайным тупіку „Возера". Там не прынялі, перавезлі на Якуба Коласа ў Савецкі РАУС, недзе за прыпынак ад Дому друку. Там рабілі ўсё, каб чалавек цалкам пераканаўся ў злачыннасці ўсёй праваахоўнай сістэмы. Такі загад клятвапрушальніка.

Людзям папросту малявалі іхні партрэт злачынцы, каб і не думалі нічога аб праве. Паралельна выяўлялася, што ніхто з гэтых наймітаў злачыннай сістэмы не ведае, што за горад Маларыта, Смілавічы, Заслаўе, увесь час гучалі папрокі, што «вы занадта багата жывяце» (нібы ў гэтым злачынства нашых студэнтаў, рабочых, мастакоў, журналістаў?). Але факт: сваё злачынства рэжым ажыццяўляе з дапамогай чужынскіх наймітаў, з якімі ты, народзе, гаворыш на адной мове. Вось таму я і разверыўся ў наш міф пра незалежнасць, бо менавіта Расія паставіла сюды свайго прэзідэнта, каб ён зруйнаваў беларускі закон і саму незалежнасць, а чужыя мянты будуць дакараць вас: „Дык з'язджайце адсюль, са сваёй зямлі". Вас зробяць злачынцам ужо за тое, што пакарысталіся роднай мовай, бо пануе тут расейскі акупацыйны рэжым, з якім мірна варкуе Захад.

Сярод арыштаваных апынулася нават група наіўных БРСМаўцаў, якія вырашылі 22 чэрвеня наведаць музей Вялікай Айчыннай вайны (ён таксама ў зоне хапуна), а былога журналіста, інваліда 2-й групы Вітаўта Мартыненку, даставілі дамоў сябры каля гадзіны ночы ў каматозным стане, дзе зноў яго ўратавалі ў злачыннай дзяржаве не медыкі, не педыкі ў пагонах, а родная матуля. Вось ваша адзіная надзея і апора, дарагія беларусы.

Вітаўт МАРТЫНЕНКА

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Вялікая вада і чалавечае гора

Спрэчка са спадаром Дэмяновічам, энтузіястам вадасховішча

У 1989 годзе на рацэ Нарве пабудавалі вадасховішча „Семяноўка". Каб атрымалася штучнае возера, знішчылі вёскі Луку, Рудню, Боўтрыкі, Гарбары і Буды.

Людзей, якія ўсё жыццё пражылі ў вёсцы, у драўляных хатах, якія мелі жывёлу і гаспадаркі, перасялілі ў шматпавярховыя блёкі ў гарадах. Людзі страцілі свой дабытак і культуру. Яны згубілі сваю мову. На дне вадасховішча далей стаяць падмуркі вясковых хат, тырчаць абрубкі садовых дрэў, а затопленыя калодзежы палохаюць аматараў купання, бо яны засмоктваюць людзей у гібельную пастку. Гэтая вада прынесла многа гора. Ціснецца на вусны пытанне: навошта ўсё гэта? Навошта затапілі пяць вёсак? Спецыялісты па ахове прыроды кажуць, што вадасховішча з'яўляецца пагрозай для існавання Белавежскай пушчы. А як выратаваць спадчыну людзей, якія рассеяліся па свеце?

Міхаліна Герасімюк, *Небасклон*, выпускніца Гайнаўскай белгімназіі

Якуб Смольскі — незабыты фатограф

У гісторыі фатаграфіі слаба распазнавальным фрагментам застаецца яе вясковая плынь. На вёсцы рэдка калі можна было пабачыць фотаапарат. Таму вялікім феноменам з'яўляецца Якуб Смольскі, жыхар затопленай вёскі Лука. Яна апынулася ў зоне будовы вадасховішча Семяноўка. Луку празывалі „Хінамі", таму што на адным панадворку свае хаткі і хлявы мелі пераважна некалькіх гаспадароў. Большасць складалі беларусы праваслаўнага веравызнання. Людзі, апрача гаспадаркі, займаліся таксама кавальствам, кравецтвам, ганчарствам, лоўляй рыб. На пераломе 70 і 80 гадоў XX ст. вёску канчаткова ліквідавалі. Жыхароў пасялілі ў блёкі ў Бандарах, Беластоку, Міхалове. Некаторыя людзі засталіся ў сваёй роднай старане і пабудавалі вёску Новая Лука.

Якуб Смольскі быў адзіным фатографам у ваколіцы. Фатаграфія стала яго хобі, а таксама крыніцай дадатковых грошай. Раз у год наведваў ён фэсты ў навакольных мястэчках. Здымкі Якуба Смольскага гэта вельмі добрая дакументацыя жыцця вёсак над Нарвай. У 2002 годзе ў Падляшскім музеі была адкрыта выстаўка здымкаў Смольскага, якая з'яўляецца неацэнным урокам гісторыі, а таксама добрым успамінам пра людзей з Лукі і самога фатографа.

Дарка Вапа, *Індывід*, Гімназія № 7 у Беластоку

Фельетон атрымаў вылучэнне за важнасць тэмы і за месца на гістарычную рэфлексію.

Чаму варта паглядзець „Хронікі Нарніі"?

Адкрыліся дзверы і пачалася фантастычная прыгода радні: Пятра, Зузаны, Луцыі і Эдмунда. Папалі яны ў фантастычную краіну Нарнію, дзе была суровая зіма, якую наклікала Белая Ведзьма. Дзеці, якія ў рэальным свеце ўцяклі ад вайны, трапілі ў вайну паміж Дабром і Злом у прыдуманым свеце. Рэжысёр Эндр'ю Адамс паставіў фільм на аснове сцэнарыя Клайва Стэйплза Льюіса.

Апрача спецыяльных эфектаў, такіх як чары, была паказана падляшская прырода, а дакладней вадасховішча Семяноўка ў зімовую пару. Варта паглядзець фільм не толькі з-за цікавага сюжэту, але і з-за хараства нашай прыроды.

Магда Шайкоўская, *Індывід*, Гімназія ў Орлі

Плёткі з Нарніі (-вы)

Як гэта магчыма, што ніхто не ведаў пра запіс кадраў для фільма „Хронікі Нарніі" над вадасховішчам Семяноўка? Ці гэта вялікая таямніца, ці ніхто з людзей, што жывуць у Семяноўцы, гэтага не бачыў? Тайна па сённяшні дзень застаецца нерассакрэчанай!

* * *

Некаторыя крыніцы падаюць, што акцёры фільма „Хронікі Нарніі" нават не бачылі вадасховішча Семяноўка, таму што ніколі не былі ў Польшчы.

Краявід проста прыклеілі да фільма на кінастудыі.

* * *

Эндр'ю Адамс, рэжысёр „Хронік Нарніі" пераглянуў больш за 200 розных патэнцыяльных зімовых краявідаў, але падляшскі найбольш яму спадабаўся. Паводле яго слоў, ні ў Канадзе, ні ў Ірландыі няма такіх прыгожых зімовых краявідаў і возера, якое настолькі грунтоўна замярзае, каб па ім можна ездзіць машынамі.

* * *

Гавораць, што акцёры „Хронік Нарніі" не ездзілі па свеце, толькі фільм запісалі на кінастудыі. Пастаноўшчыкі баяліся за іх здароўе.

* * *

Белая чараўніца Тыльда Суінтан засталася ў канцы найлепшай злой чараўніцай! Ці гэта іронія? Каментар дададзіце самі...

Магда Шайкоўская, *Індывід*, Гімназія ў Орлі. *Звесткі на аснове штодзённі „Gazeta Wyborcza"*

Адважны бусел

(апавяданне інспіраванае „Хронікамі Нарніі")

Бора-Здруй — прыгожы пансіянат на Падляшшы ў даліне ракі Нарвы. Многія з нас, знаходзячыся тут, здзіўляюцца чаму ў гняздзе, побач з пансіянатам, цэлы год стаіць бусел? А я ведаю. Дык, вось, пачнем ад пачатку...

Аднойчы было гарачае лета, калі бацька бусел стаяў у гняздзе са сваёй жонкай і дзеткамі. У нарваўскай даліне жыла Белая Ведзьма, яна з канца лета да вясны панавала ў гэтым кутку зямлі. У яе быў адзін прынцып — усе звяры мусілі выконваць яе загады. А калі нейкі звер засне зімою, або нейкая птушка не паспее адляцець у вырай, злая чараўніца мяняла іх у акамянелы слуп. Так было і ў гэтым выпадку...

Буслы ад самога пачатку вучылі сваіх дзяцей лётаць, каб ведзьма не перамяніла іх у помнік. Набліжаўся канец лета. Бусляты ўмелі ўжо шыбаваць і рыхтаваліся да адлёту ў цёплыя краіны. Белая Ведзьма пачала першы свой аб'езд. Калі яна была ўжо недалёка Бора-Здруй, птушкі пачулі яе прысутнасць і пачалі ўцякаць. Толькі аднаму маладому буслу не атрымоўвалася. Бацька бусел хацеў яму дапамагчы. Ратуючы свайго сына, ён не паспеў уцячы і Белая Ведзьма памяняла яго ў акамянелы слуп. Ён стаіць у гняздзе па сённяшні дзень і сведчыць пра адважны подзвіг бусла, які аддаў жыццё за свайго сына.

Паўліна Ваўранюк, *Індывід*, Гімназія ў Нарве

Інтэрв'ю з ***Ілонай Карпюк-Дамброўскай,*** *журналісткай „Нівы" і Радыё Рацыя, салісткай рок-гуртоў „Гоман" і „Ilo&friends", госцяй XXV Сустрэч „Зоркі".*

Новы слухач гэта досвед

Небасклон: *— Ты пішаш у „Зорку" музычныя фельетоны, якія друкуюцца ў рубрыцы „Музыка з кайфам". Адкуль у Цябе зацікаўленне музыкай?*

Ілона Карпюк: — Зацікаўленне музыкай у мяне ўжо з ранняга дзяцінства. Музыка гэта асноўнае хобі ў маім жыцці. Упершыю я выступіла на сцэне, калі была ў трэцім класе пачатковай школы. Тады я прыняла ўдзел у Конкурсе беларускай песні. Я спявала песні пад акардэон. Памятаю, гэта былі песні *Родны мой горад* і *Белы снег*. І, здаецца, тады заняла я трэцяе месца. Пасля я пачала сістэматычна хадзіць у Гайнаўскі дом культуры на заняткі ў музычным гуртку, які вяла дырыжорка з Гародні Анна Стрыха. Калі я вучылася ў Гайнаўскім белліцэі, я спявала ў калектыве „Знічка". У тым часе мы з сябрамі заснавалі рок-гурт „Гоман". Потым быў маленькі перапынак. А шэсць гадоў таму быў заснаваны гурт „Ilo&friends". Я таксама спявала ў царкоўным хоры. Заўсёды ў час Каляд мы разам з сястрой хадзілі калядаваць. У канцы музыка пераклалася яшчэ на газету.

Небасклон: *— У Тваёй рубрыцы часта карыстаешся інтэрв'ю. Ці са сваімі суразмоўцамі Ты сустракаешся сам-насам?*

ІК: — Найчасцей так. Хаця, вядома, карыстаюся інтэрнэтам. Часам вяду гутарку па фэйсбуку, або дасылаю пытанні па э-мэйлу. Аднак найбольшая прыемнасць, калі праводзіш гутарку асабіста і бачыш другую асобу.

Небасклон: *— У якіх выканаўцаў Ты марыш узяць інтэрв'ю?*

ІК: — У мяне няма такіх мараў. Больш даспадобы мне нечаканыя здарэнні ў жыцці. Здзяйсненне мараў бывае рэальным. Напрыклад, я хачу ўзяць інтэрв'ю ў Бона — лідара групы U2. Прыкладна, ёсць шанц, што такая сустрэча адбудзецца. Прыязджае U2 на канцэрт, у мяне ёсць ужо акрэдытацыя і я еду ў Катавіцы ці Варшаву. Там мне адведзена некалькі хвілін і я гутару з Бона. І ўсё. Мне больш цікава, калі не плануеш такіх сустрэч, а яны здзяйсняюцца. Вось пасля канцэрта побач цябе сядае нейкая зорка і ты спантанна вядзеш размову. У мяне такое бывае.

Небасклон: *— Ці Ты спяваеш, калі бярэш душ або мыеш пасуду?*

ІК: — Неабавязкова, таму што і так спяваю ў розных месцах, пры іншых нагодах, а пад душам я маю час, каб падумаць. Зараз я бяру душ, калі засынае дзіця. Я тады

магу адасобіцца, пабыць сама з сабой, магу свабодна падумаць. А калі мыю пасуду, не спяваю, бо слухаю музыку вады. Калі тады спяваю? Я, напрыклад, люблю спяваць, калі еду на машыне.

Небасклон: *— А ці часта спяваеш сынку Льву калыханкі?*

ІК: — Стараюся. Хаця даволі часта ўключаю яму дыск Зміцера Вайцюшкевіча з калыханкамі. Там ёсць некалькі песень, якія ён любіць. Мне самой часта здараецца прыдумваць яму мелодыі.

Небасклон: *— Ці бачыш у сваім сынку патэнцыяльнага музыканта?*

ІК: — Мой муж кажа, што Леў будзе джазменам. Цяжка бачыць у чалавеку музыканта, калі яму ўсяго чатыры месяцы. Бацькі, вядома, маюць свае мары наконт сваіх дзяцей. Хтосьці ў маёй сям'і сказаў, што з такім імем мусова быць пісьменнікам або паэтам (чытайце: Леў Талстой — З.). Мне самой было б прыемна каб ён займаўся музыкай.

Небасклон: *— Ці ў сённяшні час цяжка прабіцца са сваім гуртом?*

ІК: — Цяжка, бо часта не маем уяўлення колькі ў свеце існуе гуртоў. Аказваецца, у кожнай краіне, у кожным гарадку існуе шмат гуртоў. Таму складана выйсці на шырэйшыя прасторы.

Небасклон: *— Ці больш любіш спяваць перад вядомай публікай ці перад чужой?*

ІК: — Паколькі ў мяне няма вялікага хвалявання, апошнім часам мне цікавей спяваць перад новай публікай, выступаць для людзей, якія мяне яшчэ не ведаюць. Я ўжо столькі заспявала канцэртаў для людзей, якія мяне ведаюць, што мне не цяжка прадбачыць іхнюю рэакцыю. Ведаю, якія творы ім падабаюцца, што больш, а што менш...

Такі новы слухач гэта для мяне новы досвед.

Небасклон: *— Дзякуем за размову.*

ІК: — Я таксама дзякую.

Апрацоўка **Міхаліна Герасімюк,** *Небасклон*, выпускніца Белгімназіі ў Гайнаўцы

Музыка з кайфам

„No comment"? — Не! Нават трэба!

Толькі два балы аддзялялі лаўрэата першага месца ад наступнага гурту. Але для беларусаў маскоўскі фінал фестывалю Emergenza 2011 аказаўся шчаслівым!

„No comment band" не да канца спадзяваліся перамогі ў менскім паўфінале, хаця вядома, што там шансы былі вялікія. Але зусім не чакалі перамогі ў Маскве, дзе побач іх прэзентаваліся гурты з расійскай сталіцы, Санкт-Пецярбурга ці Калінінграда. Аднак спадзяванні былі вялікія, бо ў Менску журы ацаніла „No comment band" сапраўды высока і ўжо там атрымалі шмат узнагарод у якасці музычнага абсталявання.

Фестываль Emergenza быў адным з першых важнейшых прыпынкаў да кар'еры такіх гуртоў як „HIM" ці „Coldplay" (адзін з самых даражэйшых сёння гуртоў, побач „The Rolling Stones" ці „U2", на мінулым тыдні выступаў у Гдыні на адным з буйнейшых еўрапейскіх фестываляў Open'er). Зараз такія магчымасці адкрываюцца перад беларусамі, якія ў жніўні будуць змагацца за найважнейшую ўзнагароду ў фінале фіналаў, які пройдзе ў Нямеччыне.

І падумаць, што вялікага здабытку ў „No comment band" пакуль няма. Ужо пасля менскага поспеху гурт запрасіў фанатаў і журналістаў на прэзентацыю свайго міні-альбома, які склала пяць кампазіцый, а сярод іх „I wanna be Madonna", на які гурт зняў таксама відэакліп.

У чым таямніца поспеху „No comment band"? Здаецца, у радасці ад выканання музыкі. Праўда, такая ёсць пэўна і ў іншых, але трэба таксама граць прыстойна, якасна, цікава, да гэтага, калі думаць пра камерцыйны поспех, трэба граць лёгка, весела, прыемна для вуха або выпрацаваць свой унікальны стыль. На гэта ёсць яшчэ ў хлопцаў час, але варта, каб ужо цяпер прытрымліваліся свайго. На гэты момант вядома, што ў Маскве яны сталі лепшымі з ліку 24 гуртоў (зразумела паводле суб'ектыўнага журы). А як запрэзентуюцца ў Нямеччыне? Гэта застаецца толькі ў іхніх руках. Мы жадаем поспеху, бо такія поспехі патрэбныя нам усім.

i_basovka@o2.pl

Джазмен Леў у Ляўкове!!!

27 чэрвеня нас наведалі Ілона Карпюк з мужам Радаславам і чатырохмесячным сынком Львом. Мяне вельмі заінтрыгавала імя хлопчыка. Леў, імя амаль не сустраканае ў наш час. Я сама першы раз чую такое імя. Паводле Радка, Леў будзе джазменам. Чаму? Бо ўжо цяпер у пялёнках падспеўвае свае мелодыі. Мама Льва таксама хацела б, каб ён у будучым іграў на нейкім інструменце...



Лукаш Філіпюк, узнагарода за сімпатычны вобраз Льва

Аднак можа здарыцца і так, што ён не будзе захапляцца музыкай і выбярэ іншую дарогу ў жыцці, зусім не музычную. Наш характар у вялікай меры залежыць ад імя. Таму імя Леў абавязвае! Сябры Ілоны і Радка ўпэўнены, што іх Леў будзе артыстам.

Маю ўвагу звярнула таксама сувязь назваў. Нашы Сустрэчы адбываюцца ў Ляўкове, а маленькага хлопчыка называюць Львом. Гэта выпадковасць?

Уля Беразавец, *Небасклон*, Гімназія ў Нарве

Польска-беларуская крыжаванка № 28-29

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 24:

Лета, спакой, іржа, ліпа, нос, акацыя, ар, ха, ар, жар, герб. Лес, лапа, шчыт, Ас, пах, праца, паж, каня, ар, серб.

Адказ на крыжаванку № 25:

Сказ, бляск, сад, адвага, кроп, зарад, лілея, вясёлка, Аня, род, вецер, мама. Нерв, коска, ар, доля, пісар, ла, лён, нядзеля, сваяк, Ікар, ара, гак, ом, клад, ода.



Тэкст Аляксея МАРОЗА

„НЕЗАБУДКІ” СВЯТКУЮЦЬ

Калектыў „Незабудкі” з Курашава 17 ліпеня будзе святкаваць 35-годдзе сваёй дзейнасці і з гэтай нагоды ў іх роднай вёсцы будзе наладжаны юбілейны фэст, у якім прымуць удзел таксама іншыя калектывы з Чыжоўскай гміны і запрошаныя гурты. Арганізатар мерапрыемства, Гмінны асяродак культуры, разлічвае на добрае надвор’е і таму плануе наладзіць канцэрт на пляцоўцы побач вясковага клуба, на які запрашаюць усіх прыхільнікаў фальклору і больш сучасных беларускіх песень, перш за ўсё з рэпертуару калектываў з Курашава, Чыжоў і Збуча.

Цяперашні склад „Незабудак”

— У калектыве „Незабудкі” спяваюць сімпатычныя жанчыны, адкрытыя на іншых людзей. Іх рэпертуар складаюць песні, якія ў Курашаве яны спявалі ў сваёй маладосці або ўчулі ад сваіх маці. Аднак у Курашаве, так як і ў Чыжах, складана запісаць традыцыйную даўнюю фальклорную творчасць, бо яна ў гэтых сёлах практычна знікла. Затое можна пачуць там песні з расійскімі або савецкімі матывамі, якія таксама ўвайшлі ў рэпертуар „Незабудак”. Яны менавіта выступаюць з неапрацаваным фальклорам з пазнейшага перыяду і з аўтарскімі пазаабрадавымі песнямі, якія спяваліся ў мінулым на лавачках і за сталом. Акампанемент самавука-акардэаніста таксама аўтэнтычны. Менавіта так пасля вайны спявалі песні ў нашых вёсках, — расказвае фалькларыст Дарафей Фіёнік, старшыня аб’яднання „Музей малой айчыны ў Студзіводах”.

„Незабудкі” ў мінулым (фатаграфія з архіва Гміннага асяродка культуры ў Чыжах)

Калектыў „Незабудкі” — адзін са старэйшых нашых калектываў і найстарэйшы ў Чыжоўскай гміне. Засноўвалі яго жанчыны, якія любяць спяваць.

— Мы належалі да школьнага бацькоўскага камітэта і супольна пачалі спяваць на школьных мерапрыемствах. Дырэктар Падставовай школы ў Чыжах Эдвард Бай і яго жонка Катажына запрапанавалі нам падрыхтавацца і выступіць на Павятовых дажынках у Гайнаўцы. Выступ летам 1974 года на гарадскім стадыёне ў лесе лічым пачаткам дзейнасці нашага калектыву. Я ад пачатку была яго кіраўніком. Спяваць пачала вучыць нас Марыя Сапяжынская. Першапачатковы рэпертуар быў у нас просты і складалі яго песні, якія мы ведалі з маладосці, — кажа кіраўнік „Незабудак” Ніна Грыгарук. — Пасля дажынак сталі мы выступаць як калектыў у час школьных урачыстасцей ладжаных на Дзень настаўніка і ў час школьнай ёлкі, якая ў школе ў Курашаве арганізавалася як вялікае мерапрыемства. Чарговы раз мы выехалі на Павятовыя дажынкі ў Сямятычы. Тады паехалі толькі 4 жанчыны, бо астатніх мужы не пусцілі. Зрабілі мы нават свой вянок і ва ўзнагароду прывезлі з Сямятыч будзільнік.

У першым саставе на дажынках у Гайнаўцы выступілі 10 жанчын (Ніна Грыгарук, Марыя Яканюк, Яніна Грыгарук, Марыя Сапяжынская, Ніна Заброцкая, Вера Нікалаюк, Валянціна Анішчук, Надзея Артышук, Надзея Гаўрылюк і Вера Грыгарук) і 5 мужчын (спявалі тады Дзмітры Грыгарук, Віктар Грыгарук, Сяргей Грыгарук і Сяргей Шпілько, а на акардэоне падыгрываў Мікола Швед). Некалькі гадоў пазней калектыў з Курашава быў запрошаны на Ваяводскія дажынкі ў Беластоку і туды паехала ўжо 10 жанчын з акампаніятарам.

— Пазней удала выступілі мы ў памяшканні Ваяводскай рады ў Беластоку і ва ўзнагароду далі нам квяцісты матэрыял, з якога мы пашылі доўгія сукенкі — першыя нашы касцюмы. Пасля запрасілі нас на фестываль „Беларуская песня” ў Беласток. Калі мы скончылі спяваць, тадышні старшыня ГП БГКТ Мікола Самоцік сказаў на сцэне: «Мы вас не забудзем. Будзеце „Незабудкі”». І з гэтага моманту сталі нас называць „Незабудкамі”. Хутка таксама адбыліся ў Чыжах сімвалічныя „хрысціны” нашага калектыву, у якім стала пастаянна выступаць 10 жанчын. Бацькам хросным быў менавіта Мікола Самоцік, а хроснай маці Катажына Бай. Тады мы яшчэ былі маладымі і вельмі хацелася нам спяваць. У Чыжоўскай гміне не было яшчэ тады беларускіх калектываў. Самы бліжэйшы быў у Арэшкаве Гайнаўскай гміны, — расказвае Ніна Грыгарук.

Удзельніцы калектыву адзначылі, што кожны год паспяхова выступаюць на фестывалі „Беларуская песня” і кожны год вяртаюцца з гэтага мерапрыемства з узнагародай.

— На фестывалі „Беларуская песня” выступалі мы з песнямі, які спяваліся ў мінулым у Курашаве, Збучы, Кленіках, Лушчах ці Тыневічах — у тых вёсках, адкуль выводзіліся нашы жанчыны, якія выйшлі замуж у нашае сяло, — кажуць спявачкі.

За заслугі ва ўкараненні і распаўсюджванні мясцовай культуры ў 1996 годзе члены калектыву атрымалі індывідуальныя адзнакі „Заслужаны дзеяч культуры”.

— Мы — беларускі калектыў. Выступаем з песнямі, якія калісьці спявалі мы і нашы мамы, — гаворыць Ніна Грыгарук — вялікая індывідуальнасць калектыву „Незабудкі”.

— Без Ніны Грыгарук цяжка ўявіць сабе курашаўскі калектыў. Ніна — таксама культурны дзеяч, творчы чалавек. Напісала яна гісторыю свайго сяла, якую плануем надрукаваць у „Бельскім Гостінцю”. Для яе пісьмовай творчасці найбольш характэрныя гумарыстычныя расказы, з якімі яна часта выступае на сцэне паміж песнямі. У калектыве патрэбная такая асоба, з радасным падыходам да жыцця і людзей, якая адначасна ўмее мабілізаваць калектыў да рэпетыцый і канцэртаў. У вельмі вялікай ступені дзякуючы ёй калектыў так доўга дзейнічае, — кажа Дарафей Фіёнік са Студзіводаў.

— Мы не перарабляем нашых песень на больш сучасны лад, толькі захоўваем іх у арыгінале і толькі дабаўляем акампанемент на акардэоне, — расказваюць жанчыны з Курашава.

Курашаўскія самадзейнікі выступалі на аглядах з цікавымі абрадавымі сцэнкамі і дыялогамі па-свойму. Раней „Незабудкі” рэгулярна выступалі на „Купаллі” ў Белавежы, а апошнім часам часцей сталі спяваць на „Ператочы”. Ад васьмі гадоў рэгулярна прэзентуюцца на фестывалі „Купалінка” ў Ляневе і ад пачатку на Археалагічным фэсце ў Збучы. Жанчыны з Курашава выступалі на фестывалі „Там по маёвуй росі” ў Студзіводах, спявалі на Фестывалі нацыянальных меншасцей у Пуньску і часта славяць свой фальклор на фэстах ладжаных ў Чыжоўскай і суседніх гмінах. Здарылася ім таксама выступіць на мерапрыемствах у Сопаце і Гдыні.

— Пасля Міколы Шведа на акардэоне стаў нам падыгрываць Павел Карзуновіч. Пазней нядоўга прыязджаў да нас Сцяпан Копа, які таксама вучыў нас правільна спяваць. Інструктарам нашым быў таксама Янка Крупа, а апошнія 20 гадоў нашым акампаніятарам з’яўляецца Сяргей Аўксенціюк, — пералічвае Ніна Грыгарук.

— Я ад дзяцінства спяваю, бо люблю песні. Уключаючыся ў дзейнасць калектыву, я забывала аб жыццёвых клопатах, — тлумачыць Марыя Яканюк.

— Выступы з калектывам на сцэне дзейнічалі на мяне як наркотык і прыцягвалі да ўдзелу ў жыцці калектыву. Думаю, што мусова і надалей спяваць, — разважае кіраўнік калектыву Ніна Грыгарук.

— Раней мы гадавалі нават па дзвесце свіней і я мусіла спачатку ўправіцца дома і толькі пазней ехала на рэпетыцыі. Аднак спраўлялася я з работай на гаспадарцы і мела час на выступы з калектывам, — расказвае Яніна Грыгарук. — Я таксама ад малой спявала і любоў да спеву дапамагала справіцца з перашкодамі.

Мае суразмоўцы звяртаюць таксама ўвагу на малодшыя асобы, якія прыступалі да калектыву.

— Калі малодшыя жанчыны далучаліся да нас, то доўга не спявалі, бо мужы не дазвалялі ім ездзіць на мерапрыемствы, якія позна канчаліся. Бывала, што зайду я да мужа нашай спявачкі, прашу, прашу яго, каб пусціў жонку на выступы, а ён адкрывае дзверы і выганяе мяне з хаты. Аднак Ірэна Несцярук, наймалодшая з нас, засталася ў калектыве і надалей спявае, — кажа Ніна Грыгарук.

Зараз у калектыве выступае 6 жанчын, а на акардэоне надалей падыгрывае Сяргей Аўксенціюк. Ад самага пачатку ажно да сённяшняга дня ў калектыве выступаюць Ніна Грыгарук, Марыя Яканюк і Яніна Грыгарук, а Валянціна Сачко, Раіса Сцепанюк і Ірэна Несцярук прыступілі да калектыву пазней.

— Спачатку нам, тады яшчэ маладым, цікава было ездзіць на выступы і вясёла ў кампаніі было, — гавораць найстарэйшыя жанчыны з „Незабудак”. — Зараз, калі нам пад восемдзесят гадоў, больш складана збірацца на рэпетыцыі, а тым болей ездзіць на канцэрты.

— Мы плануем працягваць дзейнасць калектыву, калі б нават паменшаў наш склад. Покі будуць сілы, будзем ездзіць на выступы ў такім саставе, які астанецца, — гаворыць кіраўнік Ніна Грыгарук.

Гмінны асяродак культуры апякуецца калектывам і дапамагае ў яго дзейнасці.

— На мерапрыемствы возяць нас гмінным транспартам і яшчэ нейкія сродкі на расходы даюць. На Дзень жанчын заўсёды нас узвялічаюць, з гміннай управы прыязджаюць да нас з кветкамі і падарункамі, — кажуць жанчыны з Курашава. — Апошнія нашы касцюмы, якія пашылі нам у Мінску, атрымалі мы ад БГКТ, а перадапошнія пашылі за сродкі з гміннага бюджэту.

30 сакавіка споўнілася 80 гадоў беларускаму літаратуразнаўцу, культуролагу, краязнаўцу, педагогу Аляксею Пяткевічу. Прыемна, што і на Беласточчыне ягонае імя вядомае. У размовах з сяброўкамі Беластоцкага ўніверсітэта пра супрацоўніцтва з нашым Гродзенскім дзяржаўным універсітэтам імя Янкі Купалы мінулых часоў найперш згадваецца ягонае імя.

Ала ПЕТРУШКЕВІЧ

Захавальнік нашай спадчыны

Лёс назаўсёды звязаў Аляксея Міхайлавіча Пяткевіча з нашай Гародняй. Зараз немагчыма ўявіць, што тая выпадковасць магла не адбыцца. У далёкім 1957 годзе Аляксей Пяткевіч, выпускнік аспірантуры пры Інстытуце літаратуры Акадэміі навук, атрымаў размеркаванне ў гэты ж інстытут. Але праца кабінетнага навукоўцы не надта вабіла маладога літаратара. Яны з Васілём Жураўлёвым, таксама выпускніком, сустрэліся ў скверы, што ў цэнтры сталіцы, і разгаварыліся пра размеркаванне. Жураўлёў якраз і быў накіраваны выкладчыкам у нашу ВНУ. Вырашылі памяняцца. Як проста! Па-сутнасці, памяняць лёс. Мяркую, што гэта быў шчаслівы выпадак і для абодвух навукоўцаў, і для нашай Гародні асабліва. Бо Аляксей Міхайлавіч стаў не толькі адным з самых шаноўных выкладчыкаў універсітэта, але і праўдзівым летапісцам культуры нашага рэгіёна, нястомным рупліўцам на беларускай ніве, без чыйго непасрэднага ўдзелу за ўсе гэтыя дзесяцігоддзі не адбывалася літаральна ні адна важная падзея культурнага, літаратурнага жыцця.

Пісьменніцкае асяроддзе Гародні таго часу было вельмі нештматлікім, але якія гэта былі асобы! Васіль Быкаў, Аляксей Карпюк, Данута Бічэль, юная Вольга Іпатава... Аляксей Пяткевіч непасрэдна спрычыніўся да станаўлення гэтых талентаў, не толькі нязменна аналізуючы іх творы ў грунтоўных рэцэнзіях. Гэта была суполка аднадумцаў, якія не замыкаліся на сваіх творчых „хутарах" (сёння гэта асноўная адметнасць літаратурнага працэсу), былі адкрытымі для пошуку, для цікавых сябрынаў, паездак, сустрэч. Вандроўкі ў Зэльву да Ларысы Геніюш, у Вільню ў лясную хатку Зоські Верас, да Алеся Белакоза ў Гудзевічы, дзе тварылася легенда нашай культуры — музей. Шматлікія літаратурныя вечарыны, выступы перад студэнтамі, школьнікамі. Засталіся фотаздымкі, дзе ўсе яны, маладыя і такія прыгожыя, — наша знакамітая літаратурная гарадзенская сябрына.

Ужо першая ягоная манаграфічная праца „Сюжэт. Кампазіцыя. Характар: Аб прозе Кузьмы Чорнага" стала адным з самых грунтоўных і цікавых даследаванняў творчасці класіка беларускай літаратуры. І сёння, праз трыццаць гадоў пасля выдання, да гэтай кнігі нязменна звяртаюцца навукоўцы, студэнты, настаўнікі, бо ў ёй глыбока прааналізавана адметнасць творцы як мастака аналітычнага складу мыслення, адзначаны ягоны ўплыў на развіццё беларускай прозы XIX стагоддзя. Ад першых апавяданняў да шырокамаштабных эпічных палотнаў, створаных у ваенны час, якія літаратуразнаўца называе вяршыняй творчасці Кузьмы Чорнага, галоўным для пісьменніка было пранікнуць у глыбіні чалавечай душы. У творах 1940-х гадоў асабліва відавочна „перанясенне цэнтра цяжару на ўнутраны, „падводны" рух сюжэта..., бо ў цяжкі час вайны, калі людзей „скаланула небывалая катастрофа" (К. Чорны), моцна актывізуецца іх унутранае жыццё, становіцца асабліва напружанай работа іх думкі і пачуцця".

http://rv-blr.com

Першай у шэрагу прац па літаратурным краязнаўстве стала кніга Аляксея Пяткевіча „Літаратурная Гродзеншчына. Мясціны. Людзі. Кнігі", выдадзеная ў 1996 годзе. Гэта быў сапраўдны падарунак чытачам, асабліва каштоўны для тых, хто звязаны з нашым краем „кроўнымі вязкамі" (Данута Бічэль). Захапляла ў кнізе і вялікая праца, зробленая даследчыкам, і шчырая любоў аўтара да таго, пра што апавядае. Скупыя звесткі пра творцаў (таго вымагала задума кнігі: адлюстраваць як мага шырэй багатую на таленты Гарадзеншчыну) з іх дакладнасцю, дакументальнасцю наскрозь пранізаны глыбокім лірызмам. Уступнае слова да кнігі „Ад гродзенскіх палеткаў" — гэта высокамастацкая проза, шчыры лірычны маналог аўтара, гэта ўзрушанае, эмацыянальнае слова пра край, што стаў родным: „На гэтай зямлі здаўна жылі песні. Тут цанілі трапнае слова, любілі музыкаў, шанавалі ўсякія артыстычныя здольнасці. Тут, дзе цячэ імклівы Нёман..., дзе мудра ўзіраюцца ў даўніну пацямнелыя ад часу камяні шматлікіх замкаў і бажніцаў, а ў ціхія восеньскія вечары густа пахне на ўзлесках настоем хвоі, пажоўклага лісця асіны, ліпы, клёна, цягне з поля водарам перастаялага бульбоўніку, дзе ў добрым суседстве з беларускай жывой гаворкай вякамі чуліся гукі мовы польскай, яўрэйскай, літоўскай — тут нараджаліся, клапаціліся пра добрае, светлае і адыходзілі на вечны спачын людзі, вартыя добрай памяці. Яны адчувалі сілу і хараство слова".

З першых старонак вырастае і ўсё больш узмацняецца ўпэўненасць у тым, што ўсе гэтыя творцы, героі кнігі, і тыя, каго добра ведаў, ведае, і тыя, з кім разміноўся ў часе, — блізкія, дарагія аўтару. Ён ганарыцца здзейсненым імі. Ды і сам ён — з іх кагорты. Яркія, адметныя вобразы вядомых постацей ствараюцца літаральна некалькімі фразамі-штрыхамі, што па-новаму высвечваюць асобу. Так, пра Алаізу Пашкевіч: „Была яна і лірычна цёплаю, задуменна тужліваю, калі азіралася на народныя палеткі з чужых дарог". Ці пра вытокі паэзіі „зэльвенскай непаслушніцы" (Ян Чыквін) Ларысы Геніюш, якая назаўсёды зраднілася з Прынёманскім краем: „Тут складалася яе мудрая і журботная, народнага паэтычнага ладу песня, якая поўніцца духоўнасцю, зычлівасцю да людзей, глыбокай пашанай да маральных запаветаў бацькоў і дзядоў".

Надзвычай паэтычна гучаць назвы раздзелаў кнігі. „За смугою стагоддзяў". Аўтар паказвае, як з-за схаванай за завесай часу далечы ярка высвечваюцца справы невядомых, сціплых працаўнікоў, стваральнікаў кніг. „Час абуджэння і надзеі" — так пра сапраўды зорны час пачатку XX стагоддзя, калі „шырокаю і магутнаю хваляю разлілася народная патрыятычная дзейнасць па адраджэнні Беларусі". Гэтая, ужо даўняя, кніга Аляксея Міхайлавіча — цікавае падарожжа нястомнага вандроўніка па зямлі Гарадзеншчыны, што адкрывае для чытачоў свет, багаты на таленты. Падарожжа ў мінулае і сённяшняе. Кніга, вельмі патрэбная даследчыкам нашай зямлі, новым пакаленням краязнаўцаў, як і даведнік „Людзі культуры Гродзеншчыны" (2000 г.), што па сутнасці з'яўляецца сапраўднай энцыклапедыяй. Аўтару давялося абмяжоўваць змест выдання толькі імёнамі тых асоб, што нарадзіліся на тэрыторыі сённяшняй Гарадзеншчыны. Таму не ўвайшлі сюды імёны М. А. Янкоўскага, І. Я. Лепешава, Ю. Пацюпы і многіх іншых, чый шлях цесна пераплецены з нашым краем. Як назаўсёды ў ягоную гісторыю ўпісана і імя шаноўнага аўтара, ураджэнца Мінскай вобласці.

Многія з асоб, узгадаваных нашай зямлёй, сталі знакамітымі дзеячамі культуры розных краёў, але перашапачатковым этапам фармавання кожнага чалавека з'яўляюцца родныя вобразы, пейзажы, уражанні. І няхай тыя птушкі разляцеліся з родных гнёздаў, каб часцей за ўсё ніколі сюды не вярнуцца, на гэтай зямлі павінны ведаць, каму яна дала крыллі.

У прадмове аўтар не выключае магчымасці вярнуцца „да гэтага матэрыялу, каб падрыхтаваць новае, больш поўнае выданне, калі будзе ў гэтым грамадская патрэба". Грамада, яна і ёсць грамада. Грамадскія патрэбы ў цывілізаваных краінах вызначаюць якраз людзі культуры. Усё ж жыве надзея, што Аляксей Пяткевіч зможа прадоўжыць гэтую працу.

Літаральна ўсё значнае, што мае дачыненне да кніжнай культуры нашага краю, сабрана даследчыкам пад вокладкай на першы погляд сціплай, але такой каштоўнай кнігі „Маршруты кніжнага слова: з гісторыі кнігі, друку на Гродзеншчыне" (2002 г.).

Манаграфічнае выданне „Старонкі спадчыны: культурнае памежжа Гродзеншчыны: працэсы, з'явы, асобы" (2006 г.) уяўляе сабой не проста зборнік артыкулаў, рэцэнзій, прысвечаных разнастайным з'явам культурнага жыцця нашага краю, а ўспрымаецца як цэласнае даследаванне літаратурна-культурнага працэсу на працягу вялікага часу, на фоне якога яскрава вымалёўваюцца яркія постаці дзеячаў культуры. Самыя адметныя з мінулага — Адам Міцкевіч, Эліза Ажэшка, творцы пазнейшага часу: сціплая руплівіца Зоська Верас, якую „можна лічыць апошняй з магікан слыннай нашаніўскай эпохі", пясняр сялянскіх ніў Міхась Васілёк, Ларыса Геніюш, якая ў сваёй паэзіі „любоў да Беларусі ўзняла да ўзроўню малітвы", Міхась Явар, Васіль Быкаў, Аляксей Карпюк, Данута Бічэль...

Гарадзенскі крытык адным з першых на Беларусі звярнуў увагу на творчасць беларускіх пісьменнікаў Польшчы, у прыватнасці ў гэтую кнігу ўвайшлі артыкулы пра паэзію Віктара Шведа („Талент драматычны і светлы") і прозу Сакрата Яновіча („Беларускі чалавек з-пад Беластока").

Сёння Аляксей Пяткевіч, апроч многіх важных спраў, робіць асабліва патрэбную: рыхтуе да друку беларускі настольны перакідны краязнаўчы каляндар. На матэрыяле Гарадзеншчыны. Гэта ўнікальнае выданне, першае на Беларусі. Выйшлі ўжо два выпускі.

Мы з павагай называем шаноўнага прафесара Настаўнікам усіх беларускіх гарадзенцаў. Ягоны ўплыў на літаратурны, культурны працэс у нашым краі вельмі значны. Апроч актыўнай творчай працы ўзначальваў кафедру беларускай літаратуры ГрДУ, быў заснавальнікам і кіраўніком кафедры беларускай культуры, шмат гадоў кіруе гарадской суполкай ТБМ.

У Аляксея Пяткевіча яшчэ шмат задум. Няхай яны здзейсняцца!

Падарунак Дзятлаву ад кераміста з Бацютаў

Сяргей ЧЫГРЫН

Фота Сяргея ЧЫГРЫНА

Беларускі мастак дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, кераміст, скульптар, жывапісец, сябра Саюза беларускіх мастакоў Мікалай Несцярэўскі 3 ліпеня адкрыў у Раённым доме культуры ў Дзятлаве, што на Гродзеншчыне, сваю персанальную выставу і ўсю яе бясплатна падараваў гораду.

Сотні жыхароў Дзятлава прыйшлі 3 ліпеня ў мясцовы РДК, дзе на двух паверхах адкрылася прыватная выстава Мікалая Несцярэўскага. Кіраўніцтва Дзятлаўскага райвыканкама, сябры, знаёмыя і простыя гараджане шчыра віталі свайго знакамітага і шчодрага земляка. І хоць нарадзіўся Мікалай Лаўрэнцьевіч на Беласточчыне ў вёсцы Бацюты, пасля вайны сям'я іх пераехала на Дзятлаўшчыну. „У 1945 годзе быў той час, калі палякаў перасялялі ў Польшчу, а беларусаў гналі на Усход. Мы вельмі не хацелі пакідаць Бацюты, бо ў нас было 18 гектараў зямлі, 5 кароў, некалькі коней, шмат свіней, авечак, сотні курэй. Мы жылі даволі добра. Праўда, шмат працавалі, але і шмат мелі. Жылі заможна ажно да восені 1939 года. А калі прыйшлі бальшавікі, то жыць стала цяжка. І мы пад прымусам пераехалі да сваякоў у Дзятлава на Гродзеншчыну", — прыгадаў на адкрыцці выставы Мікалай Несцярэўскі.

На дзятлаўскай зямлі і прайшлі юнацкія гады мастака. Тут ён пачаў свой працоўны шлях, адсюль пайшоў, як кажуць, у «вялікі свет». Прырода шчодра надзяліла талентамі Мікалая Несцярэўскага. Спачатку ён працаваў у арцелі па вырабе мэблі, сталяром. Там авалодаў майстэрствам апрацоўкі дрэва. А калі працаваў у Дзятлаўскім раённым доме культуры інструктарам — арганізаваў духавы аркестр. Мікалай Лаўрэнцьевіч любіць і ўмее спяваць. Дарэчы, падчас адкрыцця выставы сваім землякам ён цудоўна выканаў раманс Максіма Багдановіча „Зорка Венера".

Але сэнс свайго жыцця Мікалай Несцярэўскі знайшоў у галіне мастацкай керамікі. Праца з глінай, яе пластыка, апрацоўка заўсёды вабілі юнака. Ён паехаў працаваць на фабрыку мастацкай керамікі, што ў Івянцы, пераймаў вопыт вядомых майстроў.

У 1969 годзе скончыў Мінскі тэатральна-мастацкі інстытут (цяпер Акадэмія мастацтваў) і да самай пенсіі працаваў на Мінскім мастацка-вытворчым камбінаце. Працаваў плённа. Пазнаў таямніцы сакрэты апрацоўкі керамікі, якія і цяпер не могуць паўтарыць сучасныя беларускія майстры.

Творы мастака сёння ўпрыгожваюць фасады і інтэр'еры многіх будынкаў і ўстаноў не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Ён адзін з аўтараў афармлення станцыі метро «Плошча Якуба Коласа» ў Мінску, будынкаў аэрапорта «Мінск-2», кафэ «Бульбяная» ў Мінску. Сцены Гродзенскага тэатра лялек упрыгожваюць таксама яго творы. Мікалай Лаўрэнцьевіч займаўся афармленнем магазіна «Мінск» у Валгаградзе, працы яго можна таксама сёння ўбачыць у аздараўленчым цэнтры «Баравічок» на Дзятлаўшчыне, на сценах Дзятлаўскай гімназіі № 1, у фондах Беларускага саюза мастакоў, Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, Раўбіцкім музеі народнага мастацтва, Гродзенскім гістарычным музеі, Дзятлаўскім краязнаўчым музеі, у музеях за межамі Беларусі і ў іншых месцах. Сваім землякам беларускі мастак падараваў партрэты-барэльефы ў кераміцы каралёў і князёў Вялікага Княства Літоўскага, беларускіх пісьменнікаў, мастакоў, палітыкаў, вучоных. У дар Дзятлаву мастак пакінуў керамічныя і дэкаратыўныя скульптуры, розныя вырабы, посуд, карціны жывапісу, абразы. «Вельмі прыемна, што шэраг маіх работ застаецца ў Дзятлаве, горадзе майго юнацтва. Няхай дакрананне да прыгожага сцвярджае ўсё лепшае, самае добрае ў людзях, дорыць ім радасць», — сказаў Мікалай Несцярэўскі ў час перадачы сваіх твораў Дзятлаву і дзятлаўчанам. І яшчэ. Мікалай Несцярэўскі ўжо некалькі гадоў марыць арганізаваць сваю ўласную выставу на радзіме — Беласточчыне, а таксама беларусам Падляшша падараваць шэраг сваіх твораў. Але ні Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, ні пасольствы, ні беларусы-землякі мастака з Беласточчыны аніяк не могуць яму дапамагчы. А сам мастак-кераміст не ў сілах ужо парупіцца, тым больш, што сёлета яму споўнілася 80.

Апошнім часам у Беларусі ўлады чамусьці часцей сталі ўспамінаць аб тым, што па-за межамі іх юрысдыкцыі таксама жывуць беларусы. Дзесьці яны ёсць нацыянальнай меншасцю, як напрыклад, у Польшчы, а дзесьці дыяспарай, якая ўтварылася цягам пераезду туды немалой колькасці нашых суайчыннікаў. Тут прыкладам можа паслужыць беларуская дыяспара ў расійскай Сібіры.

Доўгія гады нацыянальна-арыентаваныя нашы суайчыннікі былі для лукашэнкаўскіх улад незаўважальнымі. Так, папраўдзе, застаецца з большага і цяпер, але пад уплывам знешніх фактараў беларускія ўлады пачалі неяк крывалапа паварочвацца да свядомых беларусаў па-за межамі краіны. Знешнія фактары — гэта, у прыватнасці „карта паляка", якая як бяльмо на воку ў лукашэнкаўскіх улад, што лічаць беларускіх палякаў, што яе атрымалі, нейкімі „няправільнымі" грамадзянамі Беларусі. Нават Канстытуцыйны суд прызнаў яе нібыта шкоднай для беларускай дзяржавы. Праўда, пры гэтым беларускія ўлады гучна заяўлялі аб распрацоўцы нечага падобнага і для замежных беларусаў. Але далей гучных заяў справа не пайшла. І праблема тут толькі адна — палякам дастаткова нарадзіцца. Адразу набываеш у камплексе да ўсяго нацыянальную годнасць. Беларусам жа трэба стаць, а лукашэнкаўскія ўлады як нарадзіліся савецкімі людзьмі, так імі дагэтуль застаюцца. Таму нават у самых дзівосных снах наўрад ці мы ўбачым створаны беларускай дзяржавай Беларускі інстытут у Варшаве. У той жа час Польскі інстутут у Мінску выдатна існуе і працуе, сведчаннем чаго з'яўляецца ягоны сайт, што месціцца па адрасе **www.instpol.by**.

Аб даным інстытуце і ягоным сайце, магчыма, і не варта было б казаць, нават спрабуючы прысароміць беларускія ўлады, калі б не адзін нюанс. Гэты сайт, нягледзячы, што ён польскі і разлічаны на жыхароў краіны, якія ў сваёй большасці размаўляюць па-руску, змяшчае інфармацыю выключна на беларускай мове. Нават слова па-польску знайсці не так ужо і лёгка.

Польскі інстытут у Мінску — цалкам культурная ўстанова. Аб гэтым сведчыць і інфармацыя, што месціцца на старонцы „Пра нас". „Мэтай дзейнасці Польскага інстытута ў Мінску з'яўляецца распаўсюджванне дасягненняў польскай культуры і навуковага жыцця, пашырэнне ведаў пра польскую культуру сярод беларусаў, а таксама развіццё кантактаў, абмен вопытам і падтрымка дыялога паміж польскімі і беларускімі прадстаўнікамі навукі, літаратуры, мастацтва, кіно, тэатра і музыкі", — прэзентуюць сваю ўстанову польскія дыпламаты. Што ж тычыцца супрацоўнікаў Інстытута, то іх усяго шэсць і прозвішча кожнага з пасадай пададзены на той жа старонцы.

Увогуле сайт пабудаваны даволі цікава і нетрадыцыйна адносна большасці беларускіх сайтаў. Акрамя таго, што ёсць асобная рубрыка „Навіны", дзе месцяцца аб'явы Інстытута і паведамленні аб культурных мерапрыемствах у Польшчы, існуе рубрыка „Падзеі". Яна тычыцца падзей, датычных уласна Інстытута.

Сярод іншага Польскі інстытут у Мінску арганізуе дармовыя курсы польскай мовы ў некаторых абласцях Беларусі. Цікава, а ці з'явяцца пры беларускіх пасольствах курсы беларускай мовы хоць бы ў адной краіне свету?

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

С БЕЛАРУСІ к а р б ы

Гонар Грунвальду

У гісторыі трагедыя і слава пераплятаюцца так часта, што ўрэшце прыходзіць час асэнсавання гэтай з'явы і роздум над нашым існаваннем на гэтай зямлі. Мяркуючы спачатку назваць гэты нарыс „Слава Грунвальду", міжволі падумалася, што славу сваёй нацыі людзі прыносяць культурнымі, стваральнымі здабыткамі. А якая слава ў выйгранай шматгадовай вайне, у кровапралітнай бітве, якія прыносяць тысячы, дзесяткі тысяч смерцяў, сямейных трагедый, незваротных ахвяр, якія аддалі жыццё заўчасна ў пашчу ненажэрнага паганскага бога Марса? І разам з тым стэрэатыпнасць гістарычнага прасторавага мыслення ўкараняе ў свядомасці менавіта такія вызначэнні. Аднак, усе войны падзяляюцца на заваёўныя і вызваленчыя. Тая страшная вайна была для нашага княства найперш абарончай. І хоць вырашальная баталія адбывалася ўжо на чужой зямлі, яна была для нас вынікам змагання за незалежнасць.

Лёсавая бітва так званай Вялікай вайны 1409-1411 гадоў паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Польшчай з аднаго боку і Тэўтонскім ордэнам з другога, якая адбылася паблізу мясцовасці Грунвальд 15 ліпеня 1410 года, прынесла сапернікам незлічоныя страты. Можна сказаць, што аб'яднанае ўсходнееўрапейскае войска з часткай татарскіх атрадаў разбіла заходнееўрапейскі рыцарскі легіён, у якім былі сабраны прадстаўнікі многіх краін. Адна з буйнейшых сярэднявечных бітваў прывяла да таго, што войска Тэўтонскага ордэна пацярпела жорсткую паразу. Гэта настолькі засела ў генетычнай памяці германцаў, што нага ўзброенага немца больш паўтысячы гадоў не ступала на беларускую зямлю. Аднак, нашай гісторыі так і не ўдаецца збіцца з наканаванай спіралі развіцця. Як неяк заўважыў Зянон Пазьняк: „Што б не адбывалася ў гісторыі, немцы і расейцы заўсёды супраць нашага Вялікага Княства".

Бітва пад Грунвальдам ці Дуброўнам (сучасныя літоўцы называюць яго таксама „Жальгірыс") была і часам выяўлення найбольшага вайсковага таленту вялікага князя Вітаўта. Яму прыпісваюць такую фразу адносна крыжакоў, звернутую да сваіх ваяроў: „Ну і што, што яны ў латах? Я дам кожнаму з вас па вядры!". Пішуць таксама, што пакуль Вітаўт выяўляў сваю кемлівасць і адвагу, Ягайла, якога ў нас не любяць (і ёсць за што), доўга маліўся ў сваім шатры, карыстаючыся ахвярнасцю саюзнікаў. Як бы там не было, маем разам з палякамі пасля гэтай страшнай бітвы агульны гонар.

У найноўшы час, калі пасля развалу Савецкага Саюза адкрыліся граніцы, гарадзенскія „харугвы" пабывалі на Грунвальдскім полі прынамсі тры разы. У 1990 годзе падчас урачыстага „круглага" святкавання яе ўзначальваў гісторык і адзін з лідараў „Паходні" Міхась Ткачоў. Польшча і Літва тады былі прадстаўлены на роўні прэзідэнтаў. У 1997 годзе мы прыехалі аўтобусам падчас звычайнага штогадовага адзначэння, а арганізатары гасцінна адвялі нам, нашым сцягам і харугвам, пачэснае месца ў цэнтры. Але найбольшыя ўражанні засталіся, канешне ад святкавання юбілейных 600-х угодкаў у 2010 годзе. Страшная спёка, мноства рыцараў стракатых адценняў, мора разнастайнай сімволікі і гістарычных касцюмаў, сярэднявечная музыка, шматлікія баі, урэшце рэканструкцыя самой бітвы.

Грунвальдскае поле, палітае крывёй дзесяткаў тысяч чалавек, уражвае сваёй прасторай. Дух захоплівае, калі ўявіць, што больш сямі гадзін тагачасныя ваяры малацілі адзін аднаго страшным і вострым жалезам, які бразгат, крык і стогн стаяў пад чыстым небам. Зараз на Грунвальдскім полі багата вялікіх і маленькіх помнікаў. Але, хіба, бракуе хрысціянскага храма.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Варожыя надпісы

Апошнім часам у Гайнаўцы на сценах жылых блёкаў пачалі з'яўляцца надпісы „Польшча для палякаў". Мне, мясцоваму беларусу, гэты лозунг пахне нацыяналізмам і ўспрымаю яго як варожы жэст у адносінах да беларускай часткі насельніцтва нашага горада.

Асабліва ўзбударажыў мяне чорны надпіс на фасадзе жылога блока па вуліцы Рэя, 10 (на здымках), па суседску з царквой Іаана Хрысціцеля.

Каму прыйшла ў галаву такая дурніца, пакуль што невядома. Як далей будзе працягвацца наша жыццё з такімі лозунгамі таксама не ведаю. Пажывём — пабачым.

(Прозвішча і адрас да ведама рэдакцыі)

Інга ЯЦЬВЯЗЬ

Па слядах аднаго міфа

Звялікім задавальненнем прачытала я артыкул Віктара Буры „Гайнавяне ў Свіслачы і Гродне". На роздум адразу прыйшло: „Даўненька я не браў у рукі шашку". Або шашкі. Значэння гэта не мае. Наша беларуская гасцінасць рэч добра вядомая. Але, здаецца мне, зараз яна пяройдзе ў разрад артэфактаў, або легенд, як славутыя беларускія туры. Папросту вымра. Я шчыра ўзрадавалася за вашу кішэню пасля наведвання нашых прадуктовых магазінаў. Менавіта за вашу, бо для маёй гэта ўжо занадта. Справа ў тым, што жывём мы ў розных краінах. І калі сярэдні заробак у Польшчы ў траўні склаў 880 еўра, то ў Беларусі ён скаціўся да 200-300 долараў!? „Таварaў пад дастатак"? Але, папершае, купляем менш. Па-другое, жывём запасамі, зробленымі яшчэ да падаражання.

Прыемна ўразілі вас дзіцячы садок і сярэдняя школа ў Дабраволі, дзе навучанне вядзецца па-беларуску. Вельмі шкада, што не давялося вам наведаць беларускамоўныя школы і садкі ў Гародні. Дзіўна, чаму ж „гаспадары гэтага прыгожага горада" пазбавілі вас такой асалоды? Можа таму, што гэта проста немагчыма? Бо няма ў нас гэтых беларускамоўных школ і садкоў! А на вывучэнне роднай мовы адводзіцца менш часу, чым на вывучэнне рускай, англійскай або нямецкай.

Ёсць у мяне адна знаёмая. У свайго сына яна пачула „страшэнны моўны дэфект". Яе дзіця размаўляе па-руску з беларускім акцэнтам! Хлопчык неверагодна прыгожа „дзэкае", „джэкае" і „чэкае". Маці перажывае за будучае дзіцяці ды бясконца цягае яго да лагапеда, каб выправіць моўныя „недахопы", бо сыну трэба будзе жыць і рабіць кар'еру ў Беларусі. А тут ні адно справаводства не вядзецца па-беларуску.

Дык вось, наша агульная гістарычная Бацькаўшчына нагадвае мне гэткага клапатлівага лагапеда, які нішчыць нашу мову, а заадно нагадвае і псіхіятра, які „выпраўляе" нашы мазгі.

„Толькі беларускі народ павінен вырашыць долю сваёй краіны" — кажаце вы. Сапраўды так. Пагаджаюся. Але я, прыкладам, не ведаю, што вырашыў мой народ, які лёс выбраў 19 снежня 2010 г. Праўды нам пра наш выбар так і не сказалі.

Фрыдрых Ніцшэ ў сваім „Так казаў Заратустра" папярэджваў: „Асцерагайцеся таксама святой прастаты. Яна любіць гуляць з агнём — агнём вогнішчаў". Вы мне нагадалі тую старэнькую бабульку, якая піхала галлё ў вогнішча, на якім інквізіцыя паліла Яна Гуса. „Святая прастата" — усклікнуў той.

„А яшчэ засцерагайцеся прыступаў сваёй любові. Занадта хутка адзінокі працягвае руку таму, хто яму сустрэўся". Так казаў Заратустра. А ў Анатоля Зэкава таксама ёсць пранізлівыя радкі. „Хто адракаецца ад мовы/...застаецца/ без Радзімы/ без маці/ без роду-племені...

Адгаданка

1. чарнобыльская рака, 2. муж бабы, 3. літаратурнае прозвішча Аляксандра Прушынскага, 4. вялікі кантынент, 5. дзяржава з Браціславай, 6. без яго мужык не пераажагнаецца, 7. кароткі вясёлы сюжэт, 8. над зямлёю, 9. сталіца Нікарагуі, 10. хімічны выраб, 11. вандруе дымаходам, 12. мяккая трубачка для зубной пасты, 13. спадзяванне, 14. тытул феадальнай знаці ў цюркскіх народаў, 15. спецыяльны прыбор альбо сукупнасць устаноў, якія выконваюць вызначаную грамадскую функцыю, 16. французскі горад між Авіньёнам і Манпелье, 17. абрэвіятура арганізацыі Бан Кі Муна, 18. сукупнасць юрыдычных навук, 19. гарадок на Івенцы, 20. лагічнае значэнне, 21. пецярбургская рака, 22. заходнесібірскі нафтапрамысловы цэнтр, 23. знешні выгляд худога чалавека, 24. свіран, 25. вулей у дупле, 26. чарнаморскі паўвостраў, 27. спосаб дзеяння, прыём, 28. від музыкі, зроджаны ў ЗША на мяжы XIX і XX стагоддзяў на аснове сінтэзу афрыканскай і еўрапейскай музычных культур.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з літарай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — страфа ананімнага аўтара. **(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 24 нумара

Бег, бой, Быкаў, век, галас, Грэй, Карэя, ляляк, муха, Ной, нос, сон, цела, ява.

Рашэнне: **Хацеў бы каб воля гуляла са мной, каб сонейка грэла як грэе вясной.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.



17.07 — 23.07

(22.03. — 20.04.) Занадта палягаеш на сваім розуме; не ўсе апытанні вырашаюць пры дапамозе логікі. Няблага паразлічваешся з усім, ды лёс патрабуе не халоднага разліку. Час ад часу пусці справы на самацёк. Будзь цярплівым дома.

(21.04. — 21.05.) Калі хочаш пазбыцца кепскіх звычак ці пахудзець, лепш не гаварыпра гэта іншым. Любі сябе самога і адабрай сваё цела (якое б ні было!). Будзеш задаволены пад канец тыдня, можа і папраўляцца фінансы. Разбярыся ў сваіх сакрэтах! Свае эмоцыі трымай пад кантролем, ды не забягай з гэтым задалёка.

(22.05. — 22.06.) Не лятай у аблоках, займіся больш зямнымі пытаннямі, звязанымі з нерухомасцямі і іншымі матэрыяльнымі каштоўнасцямі, бо чакае цябе шэраг юрыдычных спраў. Пільнуйся пры здзелках. Поспех з усялякімі папяровымі справамі, могуць адкрыцца таксама новыя перспектывы і іншыя формы дзейнасці. Планы рэалізуй пасля афармлення кантрактаў і дамоў.

(23.06. — 23.07.) Могуць цябе турбаваць незразумелыя настроі. Стабільнае фінансавае становішча (заробкі роўныя расходам). Другая палова тыдня мілая ў эмацыянальных адносінах. Не будзе, праўда, прыступаў беспрычыннай радасці, а хутчэй стабільнае задавальненне абгрунтаванае добрымі падзеямі.

(24.07. — 23.08.) Будзеш крыху мітусіцца пры выбарах, таму што будзеш жарсны, эмацыянальны і хутка можаш стаць ахвярай памылкі. Шмат што будзеш уяўляць, не ўсё ўспрымеш рэальна. Дазволь сабе на адпачынак. Цешся тым што маеш. Актыўна пачні дзейнічаць пад канец тыдня. З 23.07. паявіцца шанц на кар'еру ў новай галіне дзейнасці.

(24.08. — 23.09.) Тыдзень важны для твайго далейшага жыцця, хоць на першы погляд гэтак не будзе здавацца. Чакае цябе сур'ёзны выбар ды, выбіраючы адно, трэба будзе адмовіцца ад другога (у прафесіі і ў любові!). Заглянь у сваё сэрца! Інтуітыўна ва ўсім разбярэшся сам. Правільны выбар прынясе гармонію і дабрабыт.

(24.09. — 23.10.) Можаш паспяхова сесці на раздзельную дыету (неспалучання бялкоў з вугляводамі). Удача ўсміхнецца і ў фінансавых справах. Ды не чакай адразу вокамгненнага поспеху. Але ўніз пойдуць эмацыянальныя шалькі. Адчуеш сябе крыху пакінутым, ды гэта ты сам адыдзеш убок ад іншых. Але і ад такога можаш мець карысць.

(24.10. — 22.11.) Пачуеш уладу ў сваіх руках, пачнеш новае, актыўна падзейнічаеш у напрамку сваёй будучыні, развіцця. Можаш быць крыху разгублены ў выбары кірунку. Не распыляйся, засяродзься на чымсьці адным. Трымайся пастаяннага рытму дня.

(23.11. — 22.12.) З 20.07. (да 24.07.) прытрапяцца дробныя непаразуменні; пільнуй дэталяў, грошы лічы два разы. Папрактыкуй цела, ды не выціскай з сябе сёмага поту. Лёс — у тваіх руках. У першай палове тыдня пільнуйся, каб не стаць ахвярай падману. Што б ні было, канец тыдня будзе ўдалым. Міла дома, стабілізацыя ва ўсіх сферах, асабліва на працы.

(23.12. — 20.01.) У тваім жыцці ідуць перамены, прачнешся да новага жыцця. Нельга заседжвацца на адным месцы, калі нават яно добрае. Мы ж самі ў пастаянным руху. Перамены, вядома, на гэтым тыдні не закончацца. Пастаў перад сабою заданне, пасля вырашэння будзеш рады і спакойны.

Вадалей (21.01. — 19.02.) Падзеі, што бударажылі тваю душу, ужо ў мінулым. Час спакойнага сузірання, гармонія. Добры час для роздумаў, але і для якаснага вырашэння рабочых пытанняў. У справах аб'яднайся з іншымі, бо ў апошнюю дэкаду ліпеня твае батарэйкі будуць разраджаны. Перад табою адкрыюцца новыя гарызонты, спатрэбяцца новыя сілы.

Рыбы (20.02. — 21.03.) Ты ў дасканалай форме, таму бярыся за ўсё, што патрабуе сілы і энергіі. Ды 19-23.07. хтось схоча старпедаваць твае планы, можаш адчуць сябе абмінутым. Не звяртай увагі на драбязу!

Агата АРЛЯНСКАЯ

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.

Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк, Янка Целушэцкі.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty.
Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju.
Cena prenumeraty kwartalnej
— 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734
Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2011 roku — 52.
Przesyłka zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.
Przesyłka priorytetowa: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 7,20 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 000 egz.

Тэкст і фота
Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Межавы цэнтр Еўропы

Ранішні поезд з Беластока ў Сувалкі найбольш пасажыраў губляе зараз за Васількавам — высыпаецца з яго звыш дзесятка ягаднікаў. Рух на чарговых прыпынках ужо меншы, нават у Саколцы, дзе з поезда выходзіць між іншым трое ці чацвёра чыгуначнікаў, якія займаюць экіпажныя месцы ў электрычцы ў Кузніцу. Чыгуначнікі тыя валакуць з сабою вялікія сумкі, амаль такія, якія калісь насілі вясковыя лістаношы. У лістаношаў у той час было многа газет, а што цяпер у чыгуначнікаў?.. Можна меркаваць, што іхнія сумкі запоўнены рознымі справаздачамі пра інтэнсіўнасць пасажырскіх патокаў для чытання важным і шматлікім чыгуначным чынавенствам...

У Каменнай-Новай з поезда злажу толькі я. Пасля апошняй вайны гэтая станцыя канчала чыгуначны маршрут з Сувалкаў у Гродна, бо далей, ад Каменнай-Новай да Гродна, рэйкі былі зняты. У геркаўскі, бадай, час новы чыгуначны маршрут быў пракладзены з Каменнай-Новай, але ўжо ў Саколку. На цяперашні час гэтая лінія траціць мясцовае значэнне, хаця не надта даўно набыла яна міжнароднае, бо цягнікі ў Вільню з Варшавы сталі мінаць Гродна ў выніку перамяшчэння колішняй граніцы „дружбы"; курсіруюць яны акурат цераз Сувалкі, пралятаючы па рэйках меншых станцый, у тым ліку і Каменнай-Новай.

Вакзальны будынак на апошняй станцыі помніць яшчэ царскі час, не кранулі яго ваенныя завірухі. Але ў наш час ён пусты. Адкрыты толькі сенцы, у якіх пастаўлена паркавая лаўка — такая пачакальня. А з другога боку вакзала — Еўропа. На зарослым пустазеллем пустым абшырным пляцы вызначана месца для інвалідных аўтамабіляў — мабыць згодна еўрасаюзным рэкамендацыям...

Недалёка за станцыяй характэрныя для нашага краявіду рэлікты сацыялістычнага вясковага эскаэраўскага будаўніцтва. Крыху далей акуратна апрацаваны абшырны палетак тытуню — такіх палеткаў у тамашнім наваколлі шмат. У Ісландыі заканадаўцы думаюць пра продаж папяросаў толькі на рэцэпты найбольш заўзятым курцам; у нас гэта хіба яшчэ не прымецца. Яшчэ далей зарослыя ўсялякай буйнай расліннасцю аб'екты сельскагаспадарчага прызначэння ранейшай грамадска-гаспадарчай эпохі, над якімі высяцца высакавольтныя слупы для адсутнага на іх трансфарматара...

Чаму нашы людзі ўспамінаюць той геркаўскі час з такой вялікай настальгіяй, так некрытычна да нахабнай у той час прапаганды, да адсутнасці свабоды слова, свабодных прадстаўнічых выбараў? Мне вось, сузіраючы гэтыя вясковыя рэлікты геркаўскага сацыялістычнага будаўніцтва, падумалася, што менавіта ў геркаўскі час наш мужык атрымаў такую свабоду выбараў, пра якую раней мог толькі марыць. Ён атрымаў свабоду выбару паміж вёскай і горадам, калі ніхто яму не паказваў пальцам, што ён мае выбіраць, калі будаўнічы размах вабіў і туды, і сюды. Што нашаму чалавеку па сённяшніх свабодных выбарах, калі ягоныя абранцы не надта на яго азіраюцца?.. Пры Герку можна было выбраць найбольш істотнае: свой лёс, вызначыць свой кон, быць свабодным на свой лад без аглядкі на палітыкаў...

Мінаю вёску Гамулька і зараз за ёю бачу сюжэт са студзіводскім радаводам: *олень по бору ходіт*! Праўда, не па бары, толькі па асфальце, але дастойна з яго сышоў, толькі не ў бор, але ў алёс. І толькі я яго бачыў...

Перад Кударэўшчынай чарговая нечаканасць: выдатны сілуэт бетоннага апорнага пункта тамашняга адрэзка Лініі Молатава. Частка падмурка пад ім узарваная і вісіць канец той магутнай бетоннай клеткі быццам кузаў агромнага грузавіка без задняга кола. Крыху далейшы зараснік, мабыць, скрывае чарговае бетоннае збудаванне.

Між Кударэўшчынай і Звярынцам-Вялікім, пры расхадных палявых дарогах, на фоне тытунёвага палетка, крыж на бетонным пастаменце з надпісам: „Na pamiątkę 50-letniego jubileuszu kapłaństwa Ojca Św. Piusa X dnia 9go września r. 1907. Nie czyń drugiemu tego co tobie jest niemiłego. Ten pomnik fundują gospodarzy ze wsi Kuderewszczyzna Dąbrowskiej par."; Пій X займаў папскі трон з 1903 да 1914 года. У недалёкіх Ляўках зноў асаблівы помнік у гонар 50-годдзя пастырскай службы, цяпер мясцовага прэлата Яна Рэцькі, пастаўлены амаль сто гадоў пазней, у 2003 годзе — вясковая капліца. Цікава, ці ў цяперашні час стаўляюць дзе яшчэ помнікі з такім прысвячэннем?.. Варта пры гэтай нагодзе яшчэ заўважыць, што на паўночнай Сакольшчыне амаль перад кожнай хатай красуецца нейкі крыж — ахвярны або засцерагальны; засцерагальны афіцыйна перад стыхіяй, а неафіцыйна перад персанажамі народнай дэманалогіі. Паводле гэтых павер'яў нячыстыя сілы любілі збірацца ў межавых месцах часапрасторы: па палявых межах, дарогах, берагах вадаёмаў, у поўнач або ў поўдзень. Асаблівая канцэнтрацыя дзейнасці нячысцікаў размяшчалася на перасячэнні гэтых межаў, напрыклад, на расхадных дарогах, дзе стаўлянне крыжоў мела аддэманізаваць тыя месцы... Дарэчы, калі глянуць больш агульна, Сакольшчына з'яўляецца таксама свайго роду межавым месцам паміж Захадам і Усходам, паміж Еўропай і не-Еўропай, дзе гэтыя напрамкі маюць свае выразныя маральныя ацэнкі, дзе таксама трэба стаўляць засцярогі ад благога, дзе — так як перад станцыяй у Каменнай-Новай — трэба паказаць сваю станоўчую еўрапейскасць...

У Звярынцы-Вялікім кідаецца ў вочы вялікі двухпавярховы драўляны школьны будынак, які ўжо шмат гадоў пустуе. Насупраць яго мураваны двухпавярховы школьны будынак, перад якім вытаптаны панадворак — сведчанне прысутнасці тут навучання. Побач школы касцёл, пабудаваны ў 1986 годзе; Звярынецкая парафія была заснавана ў 1980 годзе з частак Гродзіскай і Дуброўскай парафій. Насупраць касцёла вясковы асяродак здароўя з зарастаючымі імхом усходкамі. За вёскай могілкі, шчыльна аддзеленыя ад дарогі жывоплотам з туй.

Згаданая толькі што Гродзіская парафія была заснавана зараз пасля Другой сусветнай вайны з частак Сухавольскай і Дуброўскай. Афіцыйны сайт Беластоцкай архідыяцэзіі так піша пра гродзіскі касцёл: „Po burzy gradowej, jaka przeszła w dniu 27 VI 1935 r. przez Grodzisk czyniąc wielkie zniszczenia, mieszkańcy uchwalili, że dołożą pieniędzy z odszkodowania, jakie dostali od rządu i wybudują kaplicę. Budową zajął się ks. Witold Ostrowski, wikariusz z Suchowoli. Kaplicę tę poświęcił dziekan koryciński ks. Bonifacy Oleszczuk 31 V 1942 r. W roku następnym ks. Jan Tomaszewski, pochodzący ze wsi Laudańszczyzna, przyczynił się do założenia fundamentów pod nowy kościół parafialny. Było to możliwe dzięki darowiźnie ziemi pod kościół i na beneficjum, jaką uczyniła Maria Klim z Żuchowa w 1942 r. Budowę tej świątyni z kamienia polnego pod wezwaniem Matki Bożej Wspomożenia Wiernych kontynuowano i dokończono po wojnie".

Геаграфічны даведнік 130-гадовай даўнасці так тлумачыць этымалогію назвы Гродзіск: „Grodzisko jest mianem, które się dość często powtarza w słownictwie geograficznym polskim albo w kształcie nazwy Grodzisk, albo Grodziec, Grodziszcze i in. Wyraża ono pospolicie miejscowość, gdzie był lub jeszcze się znajduje obronny wał, zamknięty, mniej lub więcej obszerny, poza którym w pewnej dobie dziejów naszych ludność okoliczna szukała schronienia w czasie napadu nieprzyjaciela". Каля Гродзіска, сапраўды, распаложана паша з невысокім кругавым валам вакол яе...

(працяг будзе)

Вакзал у Каменнай-Новай

Касцёл у Звярынцы-Вялікім

Прысвячэнне крыжа і капліца ў Кударэўшчыне

ISSN 0546-1960